ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 86 (3990)
НЯДЗЕЛЯ, 29 САКАВІКА 1931 г.
Цана нумару 5 коп.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА

Барацьбу за тэхнічныя культуры— на парадак дня

Партыя на працягу апошняга году аддавала асаблівы шмат увагі праблеме ільну і канапель, ня раз падкрэсьлівала выключнае значэньне гэтых дзьвёх галін сельскай гаспадаркі—ільнаводства і канаплявод­ства, як сырцовай базы нашай ільнаканаплявод­чай прамысловасьці і экспарту.

Партыя ўказала адзіна правільны шлях хуткага вырашэньня праблемы ільну і канапель. Гэта шлях будаўніцтва буйных саўгасаў і калгасаў, шлях разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце.

БССР у бягучым годзе шчыльна падыйшла да ажыцьцяўленьня задач, пастаўленых перад ёю ў галіне разьвіцьця ТЭХНІЧНЫХ культур. БССР зьяўляецца адным з асноўных ільнаканаплявод­ных раёнаў Савецкага Саюзу. Яна заклікана ў бліжэйшыя гады стаць адным з галоўных усесаюзных пастаўшчыкоў с.-г. сырцу для сацыялістычнай тэкстыльнай прамысловасьці. У трэцім рашаючым годзе пяцігодкі, у выніку другой бальшавіцкай слёзы, мы павінны дабіцца рашучага пералому ў разьвіцьці ільну і канапель. На аснове спэцыялізацыі значнай часткі раёнаў Савецкай Беларусі на аснове разгорнутага будаўніцтва спэцыялізаваных саўгасаў і калгасаў, свячасовага і поўнага ажыцьцяўленьня гістарычнай эдэзы партыі і ўраду АБ КАНТРАКТАЦЫІ, пастаўленая задача можа быць з поспехам выканана.

Ільнаводчым раёнам сёлета аказваецца аллізарная ДАПАМОГА і ўвагі. Пад ільнаводства і канаплявод­ства падводзіцца МАГУТНАЯ ТЭХНІЧНАЯ база. У ільнаводчых раёнах БССР арганізуецца большасьць вылучаных для нашай рэспублікі МТС (усяго 24). Абсталёўваецца капа 40 ільнаапрацоўчых заводаў. Завозіцца 500 ільнасеразілак, 342 машыны для абтрасваньня галовак ільну, не гаворачы ўжо аб іншых с.-г. машынах і ўгнаеньнях.

Усе гэтыя вялізарныя мерапрыемствы могуць і павінны даць жаданы эфэкт толькі ў тым выпадку, калі ільнаводчыя раёны, саўгасы, калгасы і вёскі суправоцяць другую бальшавіцкую вясну ва ўсеўзбраеньні.

Трэба прызнаць, што тэмп падрыхтоўкі на сёньняшні ДЗЕНЬ ЯШЧЭ НЕ ЗАБЯСПЕЧВАЕ ПАСЬПЯХОВАГА ВЫКАНАНЬНЯ ПРАГРАМЫ ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА ГОДУ Ў ГАЛІНЕ ІЛЬНАВОДСТВА І КАНАПЛЯВОДСТВА, што арганізацыі ільнаводчых раёнаў яшчэ не ўсьвядомілі ўсёй адказнасьці, якая на іх ускладзена партыяй. У роўнай ступені гэта адносіцца і да тых раёнаў, якія хоць і не спэцыялізаваны ў напрамку тэхнічных культур, але ПАВІННЫ ПАШЫРАЦЬ ПЛОШЧУ ПАД ІЛЬНОМ І КАНОПЛЯМІ.

Правазапартуністычная практыка ў радзе раёнаў (Гарадоцкі, Крупскі) пераважае сарваць ажыцьцяўленьне пляну ільнаводства і канаплявод­ства на 1931 год. Аб гэтым гаворяць факты.

У бягучым годзе САЎГАСЫ, гэтыя апорныя пункты ільнаканаплявод­ства, павінны засеяць 2 тыс. гэкт. ільном і 3 тыс. гэкт. канапель. Між тым новыя ільнаканаплявод­ныя саўгасы яшчэ не гатовы да сяўбы. Яшчэ не арганізавана праца, не завезены сродкі вытворчасьці, не мабілізавана рэчная маса на барацьбу за бальшавіцкую вясну. Спэцыялізаваныя саўгасы, абавязаныя ісьці наперадзе, яшчэ ня служаць узорам сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, базавой падрыхтоўкі да с.-г. кампаніі для навукольных калгасаў і аднаасобнікаў.

Недапушчальна слабая работа па арганізацыі калгаснага прыплёву ў ільнаводчых раёнах. Да гэтага часу большасьць ільнаводчых раёнаў яшчэ не дабілася рашучага пералому ў гэтай галіне, арганізацыі раёнаў не ўсьвядомілі, што без выкананьня пляну калектывізацыі нельга ажыцьцявіць плян пашырэньня плошчы пад ільном і канаплямі. Ня выканана заданьне і па вытворчым каапэраваньні. Нічога ня робіцца для арганізацыі пераходу вытворчых аб'яднаньняў на больш высокую ступень і ператварэньне іх у калгасы. Амаль няма фактаў выпучэньня ІНІЦЫЯТЫЎНЫХ КАМІСІЯЎ сё складу вытворчых аб'яднаньняў.

Толькі правазапартуністычная недаацэнка ролі калгасаў у справе хуткага вырашэньня праблемы ільну і канапель можна вытлумачыць самацёк, які назіраецца ў значнай частцы ільнаводчых раёнаў, нежаданьне і няўменьне мабілізаваць масы на барацьбу за калгас, супроць кулака.

Нікольні ня лепшая справа з ажыцьцяўленьнем вытворчых мерапрыемстваў да вясны, прычым самым адстальным і небяспечным зьяўляецца важнейшы вучастак—ДАВЯДЗЕНЬНЕ І ПРАПРАЦОЎКА ПАСЕЎНЫХ ПЛЯНАЎ. Даволі адзначыць, што капа 25 ПРОЦ. калгасаў і 50 ПРОЦ. аднаасобнікаў ільнаводчых раёнаў яшчэ ГЭТЫХ ПЛЯНАЎ НЯ МАЮЦЬ. Ва многіх мясцох, дзе пляны даведзены, яны не прапрацаваны, а ў некаторых сельсаветах дапушчаны абуроачыя ПЕРАГІБЫ (Вульскі раён). «Зьвязда» ўжо паведамляла, што ў перыяд адміністрацыйнага захапленьня пасобныя работнікі пайшлі па шляху давядзеньня пасоўных плянаў да даходу ў парадку загадаў, замест таго, каб арганізаваць іх прыняцьце і ажыцьцяўленьне ў парадку самазабавязацельствоў шляхам масавай працы. Вялізарная шкодная сьць такога грубага скажэньня дырэктыў партыі відавочна. Да сёньняшняга дня яшчэ не пакончана з ІМКНЕНЬНЯМІ АПАРТУНІСТАЎ ЗЬМЕНШЫЦЬ ЗАДАНЬНІ ПА ЗАСЕВЕ ТЭХНІЧНЫХ КУЛЬТУР, КРУПСКІЯ раённыя арганізацыі дайшлі да таго, што скарацілі плян па тэхкультурах амаль на 50 проц. Па гэтым ганебным шляху пайшлі таксама ПЛЕШЧАНІЦКІ і ПАРЫЦКІ раёны.

Зусім нездавальняюча ідзе ссыпка насенных і страхавых фондаў тэхнічных культур, а таксама і ЗАГАТОЎКІ НАСЕНЬНЯ ІЛЬНУ І КАНАПЕЛЬ.

Вялікая колькасьць машын, інвэнтару і ўгнаеньняў ляжыць на сялах райкаапсаюзаў, на станцыях чыгунак (Гарадоцкі раён), С.-Г. КААПЭРАЦЫЯ ня ўжыла рашучых мер да РЭАЛІЗАЦЫІ сродкаў вытворчасьці. Ужо канчаецца сенная дарога, а машыны і ўгнаеньні яшчэ не забраны калгасамі. Раённыя калгасныя арганізацыі ідуць па лініі найменшага супраціўленьня, імкнучыся апраўдаць сваю бязьдзейнасьць у справе рэалізацыі сродкаў вытворчасьці тым, што калгасы ня маюць наяўных сродкаў для выплаты першых узносаў. Прычынай гэтага служыць ганебны тэмп мабілізацыі сродкаў у калгасах.

«Неабходна дабіцца ў 1931 годзе сапраўднага паляпшэньня пастаноўкі ўсёй справы ўборкі як збожжавых, так і тэхнічных культур. Таму адначасова з арганізацыяй сяўбы неабходна дасканала падрыхтавацца да ўборачнай кампаніі, каб забясьпечыць правільную арганізацыю працы, лепшае скарыстаньне машын і на гэтай аснове рэзкае зьмяншэньне страт пры ўборцы і павялічэньне таварнай прадукцыі калгасаў». Выкананьне гэтай дырэктывы VI Усесаюзнага зьезду саветаў павінна быць пастаўлена ў цэнтры ўвагі калгаснай сыстэмы ільнаводчых раёнаў. Пераход на ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНУ, ВЫПРАЦОЎКА НОРМ на аснове работы лепшых калгаснікаў—павінны быць ажыцьцёўлены ў самы бліжэйшы час.

Выключную ролю ў выкананьні пляну па ільне і канаплях адыгрывае КАНТРАКТАЦЫЯ. Арганізацыі ільнаводчых раёнаў, аднак, яшчэ не зразумелі, што кантрактацыя зьяўляецца адным з важнейшых фактараў барацьбы за калгас, за выкананьне пасеўных пляноў тэхнічных культур. Апартуністычныя і бюрократычныя анёсіны да кантрактацыі ва многіх раёнах прынялі да таго, што на 20 сакавіка ў БССР было закантрактавана толькі КАЛЯ 11 ПРОЦАНТАЎ ПЛЯНУ па ільне і канаплях. Неабходна прыцягнуць да суровай адказнасьці бюрократаў і апартуністаў, якія зрываюць кантрактацыю і гэтым проста дапамагаюць кулаку ў данай справе. Неабходна бязьлітасна ўдарыць як па кулаку, так і па яго абаронцах.

За пён і канаплі з бальшавіцкай упартасьцю павінна змагацца ўся ПАРТЫЙНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ, УВЕСЬ АКТЫЎ. Адным з асноўных рашаючых моментаў у гэтай справе зьяўляецца ўладаньне ТЭХНІКАЙ.

Не павінна быць такога становішча, калі б партыец і актывіст ня меў элементарных ведаў аб умовах сяўбы і апрацоўцы ільну. Пад прыкрыцьцём псэўданавуковай аргументацыі шкоднікі затрымлівалі рост пасеваў ільну і канапель, пашыраючы тэорыю аб высілены глебы ад ільну і канапель. Такія разважаньні чутны яшчэ і зараз у радзе месц. Замест арганізацыі барацьбы са шкодніцкімі ільну, якія зьяўляюцца сапраўдным эпом, замест вызучэньня гэтых шкодніцкіх, усё яшчэ наглядзецца імкненьне затармазіць пашырэньне плошчы пад тэхкультурамі, апраўдваючыся ўсё тым-жа «высіленьнем» глебы. Узбройваючыся ведамі, кожны партыец павінен павесьці рашучую барацьбу з гэтай шкодніцкай тэорыяй, бязьлітасна біць па яе носьбітах.

ПЛЯН СЯЎБЫ ТЭХКУЛЬТУР ПАВІНЕН БЫЦЬ ВЫКАНАН І ПЕРАВЫКАН. Гэта задача будзе выканана, калі раённыя і мясцовыя арганізацыі неадкладна пераключацца на ўдарнае завяршэньне падрыхтоўкі да сяўбы, разгарнуўшы па-бальшавіцку масавую работу за калгасьніка.

Дэманструючы посьпехі калгаснага будаўніцтва і падрыхтаванасьць перадавых калгасаў да сяўбы, раённыя партыйныя і зямельна-калгасныя арганізацыі ільнаканаплявод­чых раёнаў павінны шырока азнаёміць масы аднаасобнікаў-беднякоў і сераднякоў з ПАСТАНОВАМІ VI-га УСЕСАЮЗНАГА ЗЬЕЗДУ САВЕТАЎ.

Узмацняючы дапамогу ільнаводчым калгасам, правільна арганізуючы працу калгасьнікаў на прынцыпах зьдзельшчыны, апіраючыся на калгасьнікаў, разгортваючы масавую работу сярод беднякоў і сераднякоў і наносячы рашучы ўдар па кулаку,—ільнаканаплявод­чыя раёны БССР выканаюць плян другой бальшавіцкай вясны, ідучы наперад па шляху да суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва як клясы.

Апошнія навіны

Аграрная канфэрэнцыя ў Рыме

РЫМ, 27. Агенцтва Стэфані паведамляе: «Аграрная канфэрэнцыя абрала бюро прэзыдыуму ў складзе кіраўнікоў галоўных дэлегацый, у тым ліку кіраўніка савецкай дэлегацыі Крыцмана. Італьянскі дэлегат Дыпола ў сваёй прамове спыніўся на дзейнасьці экаламічна камітэту Лігі Нацый.

***

РЫМ, 28. На пасяджэньні аграрнай канфэрэнцыі 27 сакавіка выступіў старшыня савецкай дэлегацыі—тав. Крыцман. У пачатку сваёй прамовы т. Крыцман сказаў, што ў аснове вострага гаспадарчага крызісу, які зараз пражываюць капіталістычныя краіны, і ў прыватнасьці крызісу сельскай гаспадаркі ляжыць зусім не перавытворчасьць, а зьніжэньне жыцьцёвага ўзроўню працоўных мас. Таму зусім ясна, што меры, якія вядуць да далейшага зьніжэньня жыцьцёвага ўзроўню шырокіх мас, толькі ўзмоцняць гэтыя труднасьці.

Тав. Крыцман указаў, што Савецкі Саюз знаходзіцца ў асаблівым становішчы: сусьветны гаспадарчы крызіс,—заявіў: прамоўца.—спыніўся на межах нашай краіны. Вялізарны рост савецкай прамысловасьці выклікае неабходнасьць спачатку росту сельскай гаспадаркі, якая апраецца ў асноўным на ўнутраны рынак, рост унутранога попыту, робіць для нас неабходным далейшы ўздым нашай сельскай гаспадаркі. Гэты ўздым разгортваецца ў зусім новых формах буйной дзяржаўнай і калектыўнай сельскай гаспадаркі з прыстасаваньнем навейшых тэхнічных сродкаў. Пераход да буйной гаспадаркі і мешыннай тэхнікі дае магчымасьць значна зьнізіць выдаткі вытворчасьці, якія ўжо раней былі зьніжаны рэвалюцыяй. Вялізарную ролю ў скарачэньні выдаткаў вытворчасьці адыгрывала і тая акалічнасьць, што ў нас праца шырокіх мас сапраўды стала свабодная працай без прымусу.

Далей тав. Крыцман указаў на тое, што для СССР ня ўжо цалага раду праблем, якія абумоўліваюць крызіс у капіталістычным сьвеце, а іменна: перавытворчасьць, зьніжэньне цэн, беспрацоўе і г. д. Ня гледзячы на тое, што ён далёка не дасягнуў даваеннага ўзроўню, імпэт экспарт натыкаецца на труднасьці збыту і нагоршаньня, з прычыны зьніжэньня цэн умовы продажу. Да гэтага далучаецца высунутыя супроць экспарту мерапрыемствы фінансавых арганізацый асобных краін і асобных урадаў. Делегацыя Савецкага Саюзу гатова разглядець прапановы, прыемлемыя з экаламічнага і фінансавага пунктаў гледжаньня. Для Савецкага Саюзу зьяўляюцца, аднак, зусім непрыемлемымі мерапрыемствы адносна «предпочтительных» тарыфаў, якія прабуюць пастаўіць у выключнае становішча асобныя эўрапейскія краіны, што экспартуюць збожжа». Паводле слоў Крыцмана, да гэтага часу яшчэ сям-там існуе ўяўленьне аб магчымасьці ажыцьцяўленьня сур'ёзных мерапрыемстваў у галіне сусьветнай сельскай гаспадаркі бяз удзелу ў іх абмеркаваньні Савецкага Саюзу.

Ангельскі імпэрыялізм правакуе ў Індыі рэлігійную бойню

ЛЁНДАН, 27. Становішча ў Каунхэры (Індыя ўсё яшчэ застаецца напяўным. Ня гледзячы на прыбыцьцё паліцэйскіх падмацаваньняў і атрадаў салдат, сутычкі на рэлігійным грунце ня спыняюцца. Налічваюць 112 забітых і звыш 500 цяжка параненых.

Тысячы людзей у паніцы пакінулі горад, у якім харчовае забесьпячэньне зусім дэзарганізавана. Улада ўстанавіла жорсткі строгай цэнзуры.

Нафтавая пяцігодка выканана за 2½ гады

ВЯЛІЗАРНАЯ ПЕРАМОГА САВЕЦКІХ НАФТАВІКОЎ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА АДНАЧАСОВА ПЕРАМОГАЙ УСЁЙ РАБОЧАЙ КЛЯСЫ, ПЕРАМОГАЙ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ ПАРТЫІ, ПЕРАМОГАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА, ПЕРАМОГАЙ БАЛЬШАВІЦКІХ ТЭМПАЎ

Рабочыя БССР, у выкананьні трэцяга году пяцігодкі раўняйцеся па бакінскіх таварышох

Першая нафтавая пяцігодка, зацьверджаная ВСНГ СССР у сьнежні 1928 году і ўключаная ў асноўны пяцігадовы плян сацыялістычнага будаўніцтва, фактычна ўжо выканана як Азнафтай, так і Грозьненскай. Сухія лічбы больш пераканаўча, чым самыя гарачыя прамовы, сьведчаць аб гэтым. Так, паводле пяцігадовага пляну, Азнафта павінна была ў апошнім годзе пяцігодкі здабыць 14 млн. тон нафты і газы. На справе-ж бягучы 1931 год дае 15 млн. 300 тыс. тон нафты, тады як вершы год пяцігодкі—1928-29 г.—даў толькі 8 млн. 800 тыс. тон.

Вялікі плян пачаў ажыцьцяўляцца ў кастрычніку 1928 году са здабычай у 733 тыс. тон. Сярэдняя месячная здабыча ў 1932-33 г., г. зн. праз пяць год павінна была раўняцца 1 млн. 168 тыс. тон. На справе-ж у сакавіку 1931 г. здабыта 1 млн. 181 тыс. тон, а ў красавіку—1 млн. 251 тыс. тон.

У кастрычніку 1928 г. сутачная здабыча Бакінскага раёну складала 23.743 тоны, а ў красавіку 1931 г., г. зн. праз 2 з пал. гады—ужо звыш 41 тыс. тон (супроць 38 тыс. тон намечаных планам для апошняга году пяцігодкі). Або прадукцыя Азэрбайджанскай нафтавай прамысловасьці за гэты невялікі перыяд часу павялічылася на 80 проц.

Ня менш выразна лічбы характарызуюць і другі важнейшы вытворчы працэс нафтавай прамысловасьці—сьвідраваньне. Ня толькі колькасна, але і па якасьці ў сакавіку-красавіку г. г. мы апярэджваем заданьне 1932-33 году. Сярэдняя сутачная сьвідравальная праходка ў сакавіку г. г. паказала 1.994 мэтры, г. зн. тая лічба, якая была вызначана на апошні год пяцігодкі. У 1928-29 годзе Азнафта і Галоўтортон ВСНГ ламалі галовы над тым, якую ўстанавіць праходку на 1932-33 год: ці ў 120, ці ў 160 мэтраў на варштат-месяц. Усе гэтыя спрэчкі аказаліся зьмеценымі жыцьцём. У сакавіку 1931 году рабочыя дасягнулі 181 мэтра праходкі, у красавіку будуць мець 200 мэтраў. Значыць, за 2 з пал. гады шпаркасьць праходкі павялічылася больш, чым ў 2 з пал. разы.

На парозе трэцяга году пяцігодкі нафтавая прамысловасьць атрымала новае пашыранае баявое заданьне: здабыць у 1933 годзе 45-46 млн. тон нафты, з якіх 25 млн. тон прыпадае на долю Азнафты.

Шлях рабочых нафтавікоў за мінулыя 2 з пал. гады—гэта шлях гэрачнай барацьбы за нафту, гэта рэвалюцыйны энтузіязм пралетараў, якія робяць сваю справу—справу пабудовы сацыялізму. Цьвёрда ажыцьцяўляючы генэральную лінію партыі, перамагаючы труднасьці, бязьлітасна змятаючыся з правым і «левым» апартунізмам, з прымірэнцтвам, вялікадзяржаўным шавінізмам і мясцовымі нацыяналізмамі, выкарчоўваючы рэзультаты шкоднітва—нафтавікі Грознага і Азнафты забясьпечылі сапраўды ўдарныя бальшавіцкія тэмпы работы. Так, 82 проц. грозненскіх рабочых увахоздзяць ва ўдарныя брыгады, сацспаборніцтвам ахоплена 96 проц. усіх рабочых, прадукцыйнасьць працы за 2 гады пяцігодкі ўзрасла на 54 проц.

У Бакінскай прамысловасьці сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам у даны момант ахоплена звыш 65 проц. усіх рабочых. Вялізарную ролю ў барацьбе за нафту на Бакінскіх промыслах адыграў сустрэчны прамфінплян, які ў бягучым годзе, забясьпечыўшы здабычу нафты і газы ў 15,3 млн. тон, да 2.500 рабочых прапаноў вытворчага харантару.

Бязупынна паляпшаецца становішча нафтавікоў

На аснове росту нафтавай прамысловасьці і павышэньня прадукцыйнасьці працы бязупынна паляпшаецца матар'яльнае і культурна-бытавое становішча рабочых-нафтавікоў.

Да пачатку 1931 году сярод нафтавікоў Азэрбайджану зусім ліквідавана беспрацоўе. На ўсіх прадпрыемствах Азнафты ўведзен 7-мігадзінны рабочы дзень.

Рост зарплаты рабочых-нафтавікоў за 2½ гады падняўся на 13,2 проц. Сярэдняя зарплата рабочага-нафтавіка складае ў месяц 106 руб. 82 к.

За апошнія 2½ гады на будаўніцтва рабочых кватэр было выдаткавана Азнафтай 15,5 млн. руб. У рабочых раёнах пабудаваны зусім новыя рабочыя пасёлкі: цэлыя кварталы дамоў амэрыканскага тыпу з усімі жыльёвымі выгадамі (ваны, газавае асьвятленьне і г. д.).

Некалькі млн. руб. было выдаткавана на будаўніцтва дваццаці культуры. Пры буйнейшых прадпрыемствах і рабочых пасёлках пабудаваны дзіцячыя сады і ясьлі. Ва ўсіх раёнах ёсьць зараз добра абсталяваныя лазьні і мэханізаваныя пральні. На кожным прадпрыемстве Азнафты ёсьць рабочыя сталоўкі, харчовыя пункты, каапэратывы.

Бліскучай перамогай савецкіх нафтавікоў, якія выканалі пяцігодку па здабычы нафты за 2½ гады, можа ганарыцца ўвесь Савецкі Саюз. Гэта перамога, атрыманая рабочымі і спэцыялістамі нафтавай прамысловасьці пад кіраўніцтвам кампартыі, зьяўляецца лепшым дакладам правільнасьці генэральнай лініі партыі ў будаўніцтве сацыялістычнай індустрыі, у будаўніцтве сацыялізму.

Перамога нафтавікоў мае на толькі ўнутраное значэньне. Пралетарыят усяго сьвету яшчэ раз пераконваецца ў невычарпальнай творчай энэргіі рабочых мас Савецкага Саюзу, яшчэ раз упэўніваецца ў рэальнасьці ажыцьцяўленьня пяцігадовага пляну за 4 гады.

Індыя у агні паўстаньняў

Імпэрыялісты стараюцца выкінкадь нацыянальную бойню

ЛЁНДАН, 26. Вялізарнае абурэньне шырокіх мас працоўных Індыі з прычыны пакараньня сьмерцю ў Лягоры вылілася ў бурны антыбрытанскі рух. Каб скіраваць абурэньне супроць імпэрыялістаў у рэчышча нацыянальнай міжусобіцы, мясцовыя ўлады ўжываюць звычайныя сродкі, а іменна — пацкоўваюць індусаў на мусульман.

Бурныя дэманстрацыі пратэсту супроць пакараньня сьмерцю, з прычыны правакацыі мясцовай улады, у горадзе Каунфоры ператварыліся ў сапраўдную рэлігійную вайну. Горад адрэзан ад усёй Індыі. Спынены тэлеграфныя і тэлефонныя зносіны. Паводле атрыманых вестак, у Каунфоры да гэтага часу забіта звыш 50 чал. і цяжка паранена некалькі соцень. На вуліцах валяюцца трупы.

Становішча робіцца ўсё больш сур'ёзным. Выхіляцца з розных гарадоў войска ня ў сілах справіцца з падзенямі. Забіта таксама некалькі зўрапэйцаў. У раёне Рангуна паўстанцы, якія маюць вінтоўкі, у адказ на накараньне сьмерцю ў Лягоры зрабілі напад на паліцыю і рад устаноў. У сутычках з паліцыяй забіта 28 чал. Параненых шмат. У Бірме адбываюцца непарыўныя бойкі паміж паліцыяй і паўстанцамі, якія хаваюцца ў вакольных лясох.

***

ЛЁНДАН, 26. Бурныя выступленьні мас у сувязі з жорсткімі пакараньнямі сьмерцю адбываюцца па ўсёй Індыі.

У Каунфоры хваляваньні адбываюцца з неаслабнай сілай. Абураны натоўп ірабаваў узяць штурмам будынак суда і мытная палата. Многія дамы былі спалены, тэлеграфная сувязь была спынена. Зўрапэйцаў натоўп закідваў каменьнямі. Наяўныя сілы паліцыі і войска аказаліся ня ў сілах задушыць хваляваньні. Сьпешна запатрабаваны падмацаваньні з другіх гарадоў.

Прыбыцьцё Гандзі ў Карачы, дзе павінна адбыцца сесія нацыянальнага кангрэсу, дало повад да новых антыгандзісцкіх дэманстрацый.

Групы «чырвонарубашачнікаў», праваўцы кардоны, шукалі Гандзі з крыкамі: «дзе гэты забойца?». Варожыя настрої мас у адносінах да Гандзі прымусілі лідэраў нацыянальнага кангрэсу адтэрміноваць афіцыйны прыём у гонар Гандзі.

Ударнай работай дабіцца выкананьня фінпляну

Пастанова ЦК КП(б)Б аб ходзе выкананьня фінансавага пляну

Адзначыць, што ў радзе раёнаў кіруючыя арганізацыі не ўявілі сабе ўсёй важнасьці выкананьня фінансавага пляну, як рашаючага зьвяна ўсяго народна-гаспадарчага пляну і не мабілізавалі ўвагі партарганізацый і грамадзкасьці на вырашэньне фінансавых задач першага кварталу. У выніку плян мабілізацыі сродкаў насельніцтва на 20 сакавіка выканан зусім нездавальняюча (67,3 проц. пляну цэнтру і 64,8 проц. пляну, прыпятага ў БССР).

Адзначыць, што з боку спажывецкай каапэрацыі праяўлены недапушчальна нядбайныя адносіны да справы выкананьня фінансавага пляну, у выніку чаго сарваны плян паяначапленьня па висковай сетцы і дапушчана невыкананьне пляну рэалізацыі тавараў пры перавышэньні рэштак тавараў супроць устаноўных лімітаў.

Падкрэсьліваючы, што мабілізацыя сродкаў насельніцтва на даным этапе мае выключна важнае значэньне ў справе выкананьня ўсяго фінансавага пляну, што фінансавая работа патрабуе таму максімуму ўвагі партыйных, савецкіх і грамадзкіх арганізацый, бюро ЦК КП(б)Б для ліквідацыі дапушчанага прарыву ў мабілізацыі сродкаў пастанаўляе:

1. Прапанаваць адпаведным цэнтральным установам, гаркомам і райкомам апошнія дні сакавіка скарыстаць для ўдарнай работы па выкананьні фінансавага пляну першага кварталу і разам з тым забясьпечыць бесьперабойнае пераключэньне работы ўсяго апарату і грамадзкіх арганізацый на выкананьне пляну другога кварталу і ліквідацыю прарываў першага кварталу.

2. За неданушчальна дрэннае выкананьне квартальнага фінпляну (ніжэй 45 проц.) занесьці на чорную дошку наступныя раёны: Азарыцкі, Дрысенскі, Чырвонапольскі, Лёзьненскі, Межынскі, Расонскі, Стара-Дароскі, Старобінскі, Сеньненскі, Халопеніцкі і Чарэйскі.

Разам з гэтым адзначыць прыкладнае пасьпяховае выкананьне фінпляну раёнамі: Ельскім, Касьцюковіцкім, Любаньскім, Магілеўскім, Парыцкім, Слуцкім і Бабруйскім.

3. Зацьвердзіць прыняты СНК плян мабілізацыі сродкаў на другі квартал у суме 23.728.000 руб. Даручыць гаркомам і райкомам безадкладна праверыць свячасовасьць давядзеньня раённых пляноў мабілізацыі сродкаў на другі квартал да сельсаветаў.

4. Даручыць НКФ, камісіі садзейнасьці пры ЦВК, ЦСПСБ, ЦК ЛКСМ і іншым грамадзкім арганізацыям прыняць рашучыя меры да паляпшэньня работы ашчадкас, атрыманьня рэальных вынікаў работы ашчадкас і шырокага распаўсюджваньня дзяржаўных пазык, асабліва на вёсцы.

5. Даручыць тав. Фэльдману кожную дэкаду дакладваць ЦК аб становішчы з выплатай заработнай платы, з вызначэньнем у патрэбных выпадках мерапрыемстваў, якія-б забясьпечылі свячасовую выплату зарплаты.

6. Лічыць неабходным у бліжэйшы час заслухаць на Сакратарыяце ЦК даклады:

а) Белкаапсаюзу аб выкананьні фінансавага пляну спажывецкай каапэрацыі і пляну таваразвароту;

б) ЦК ЛКСМ і ЦСПСБ аб рабоце камсамолу і прафэсыянальных арганізацый па выкананьні фінансавага пляну.

7. Ускласьці пэрсанальна на тав. Хацкевіча праверку ўсіх пастаноў ЦК па нытаньні аб выкананьні фінансавага пляну.

26 сакавіка 1931 г.

Францускі ўрад пагражае Нямеччыне разрывам гандлёвага дагавору

ПАРЫЖ, 27. Камісія палаты дэпутатаў па мытных пытаньнях прыняла адногалосна рэзалюцыю, у якой заклікае міністра замежных спраў і міністра гандлю «катэгарычна выступаць супроць канчатковага заключэньня мытнага саюзу паміж Аўстрыяй і Нямеччынай і ў выпадку, калі пратэст ня будзе мець вынікаў, — неадкладна ліквідаваць гандлёвыя дагаворы з Нямеччынай і Аўстрыяй, як гэта прадугледжана ў дагаворах, шляхам папярэджаньня за тры месяцы».

Далей рэзалюцыя дамагаецца, каб францускі ўрад пачаў перагаворы з іншымі эўрапэйскімі дзяржавамі з мэтай прыцягнуць іх да акту скасаваньня дагавораў у выпадку, калі іх супольныя дзеяньні, накіраваныя супроць заключэньня аўстра-нямецкага саюзу, пацерпяць няўдачу.

Гэтыя дзяржавы павінны вывучыць пытаньне аб заключэньні агульнай згоды ў форме шматбаковага дагавору, які павінен замяніць двухбаковую згоду і зьвязаць дзяржавы паміж сабою.

Беларуская дэлегацыя на Усесаюзным зьездзе саветаў

У Ельску робяць стаўку на май

ЕЛЬСК, 25. (Брыгада «Зьвязды»). Становішча падрыхтоўкі да веснавой сяўбы па Ельскім раёне пагражаючае.

Раённыя арганізацыі, якія павінны кіраваць падрыхтоўкай, патанулі ў моры рэзалюцый і разважаньняў, а за жывую работу не ўзяліся. Лічбы і факты сьведчаць аб поўнай стаўцы на самацёк з боку раённых арганізацый.

Калгасы яшчэ ня маюць канкрэтных пляноў веснавой сяўбы. Арганізацыя працы, рамонт інвэнтару, завоз машын і ўгнаеньня і нават такія важныя аграмерапрыемствы, як ачыстка і пратручваньне насеньня, не знайшлі месца ў плянах райкалгассаюзу.

У выніку насенныя фонды па калгасах на 20 сакавіка ссыпаны толькі на 24 проц., страхавыя фонды — на 17 проц.

Вялікі недахват адчуваецца ў насеньні кармавых культур: вікі, канюшыны, сэрадэлі і сіласных культур. Раён па сваім напрамку — жывёлагадоўчы, і адсутнасьць насеньня кармавых траў пагражае зрывам пашырэньня стада кароў і сьвіней.

Раённыя арганізацыі паслалі заяўку ў Наркамзем аб недахваце насеньня і на гэтым супакоіліся. Загатоўкі насеньня яравых і насеньня кармавых культур яшчэ не разгорнуты.

Ачыстка наяўнага насеньня падыходзіць да канца. Але тут ёсьць іншая небясьпека—ніхто ў раёне ня думае пра пратручваньне насеньня. Фармаліну і іншых прэпаратаў няма і ніхто гэтай «дробязьзю» ня цікавіцца.

Рамонт інвэнтару праходзіць здавальняюча. Асноўны наявы інвэнтар, як плугі, бароны, сявяркі, ужо адрамантаваны. Зараз рамантуюцца перавозачныя сродкі. Але і тут ёсьць перашкоды. Сампрамсаюз праяўляе рвацтва і бярэ за рамонт вупражы столькі, колькі не каштуе сама вупраж.

Траба свячасова паклапаціцца аб пастромках, якіх няма ў патрэбнай колькасьці ні ў адным калгасе.

На складах Ельскага райкаапсаюзу ляжыць на 35 тыс. руб. розных с.-г. машын і штучнага ўгнаеньня на 6 тыс. руб. Вапна ляжыць і ніхто яе не бярэ. Райкаапсаюз ніякіх мер, каб прасунуць гэтыя залежы машын, інвэнтару, угнаеньня і вапны ў калгасы, ня ўжывае.

Не разгорнута таксама работа па заключэньні кантрактацыйных дагавораў. На 25-га сакавіка не закантрактавана ніводнага гектара. Райвыканком лічыць, што кантрактацыю ў калгасах трэба праводзіць пасьля таго, як будзе закантрактавана плошча індывідуальнага сэктару. Ніякай растлумачальнай работы вакол кантрактацыі не праводзіцца.

Ніякіх канкрэтных мер па арганізацыі грамадзкага харчаваньня і ясьляй на час пасеўнай кампаніі раённыя арганізацыі не прынялі.

Зусім дрэнная справа з кармамі. Ні адзін калгас ня мае пэўных забраніраваных фондаў на час сяўбы. Галоўная прычына — гэта нядбайныя адносіны да выдаткаваньня кармоў. Так, калгас «Рэвалюцыя», ня гледзячы на тое, што сена ня хопіць да канца сяўбы, зараз дае жывёле столькі, што палова не зьядаецца і ідзе на подсьціл.

Калгас «Кастрычніцкая рэвалюцыя» заслаў усё гумно саломай, якая там гніе. Гэта ў той час, калі побач у хляве скаціна стаіць галодная.

Райвыканком абсалютна ня ведае, як кіруюць сельсаветы падрыхтоўкай да сяўбы. Праверыўшы 4 калгасы, я нідзе ня бачыў, каб сельсавет заслухоўваў даклад аб падрыхтоўцы да сяўбы.

Усе гэтыя матар'ялы сьведчаць, што Ельскі раён не дабіўся пералому ў падрыхтоўцы да сяўбы. Не завострана ўвага калгасьнікаў Ельшчыны, што яны ў БССР першымі выйдуць у поле і што на іх вопыце павінны вучыцца іншыя раёны.

Раённыя ўстановы чамусьці лічаць, што сяўба распачнецца толькі ў пачатку мая, а таму няма даго сьпяшацца.

Райком КП(б)Б ня прымае ніякіх мер, каб пакончыць з бязьдзейнасьцю раённых арганізацый.

Неабходна зараз-жа мабілізаваць усе сілы раёну на ліквідацыю прарываў у падрыхтоўцы да сяўбы.

Брыгадзір «Зьвязды» Ч.

„Сьпяшацца няма куды, заўтра з плугам не выяжджаем“

ВАГУШЭЎСКАЯ. Райкалгассэкцыя да веснавой сяўбы не падрыхтавана. Угнаеньне і сельска-гаспадарчыя машыны ляжаць на складах раёну і ў калгасы не прасоўваюцца. Ніякай работы па правядзеньні ў жыцьцё вапнаваньня глебы райкалгассэкцыя не праводзіць.

Ссыпка насеньня, рамонт інвэнтару, вывазка лесаматар'ялаў праводзіцца недавальняюча.

Некаторыя працаўнікі раёнаў на прапанову ўзмацніць тэмпы, адказваюць: «Сьпяшацца няма куды, заўтра з плугам не выяжджаем». Райкалгассэкцыя павінна неадкладна перабудаваць сваю работу.

ПРАЕЖДЖЫ.

Бальшавіцкай вясьне—бальшавіцкую сустрэчу

Пасеўныя пляны, рамонт інвэнтару, ссыпка насенных і фуражных фондаў—усё яшчэ слабыя вучасткі пасеўнага фронту

АРГАНІЗАЦЫЯЙ ПРОБНЫХ ВЫЕЗДАЎ ЛІКВІДУЕМ ТОРМАЗЫ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ПАСЕЎ

Кожны камуніст—лепшы ўдарнік на вытворчасьці

У адпаведнасьці з пастановай ЦК УсеКП(б) аб партыйнай і масавай рабоце у цэху і брыгадзе перабудаваць работу усіх вытворчых парткалектываў і ячэек КП(б)Б

НАДЫХОДЗЯЧЫЯ ПЕРАВЫБАРЫ НІЗАВЫХ КІРУЮЧЫХ ПАРТОРГАНАЎ ПРАВЕСЬЦІ ПАД ЗНАКАМ ПРАВЕРКІ РАБОТЫ ПАРТ'ЯЧЭЕК ФАБРЫК І ЗАВОДАЎ У ІХ ЗМАГАНЬНІ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ

Рэалізаваць пастанову ЦК УсеКП(б)

У надыходзячай справаздачна-перавыбарчай кампаніі кіруючых органаў, вытворчых парткалектываў і ячэек важнейшай задачай зьяўляецца праверка выкананьня дырэктыў партыі аб паваротце партарганізацый тварам да вытворчасьці, праверка, наколькі кожная пасобная ячэйка здолела перабудаваць сваю работу ў адпаведнасьці з задачамі забесьпячэньня блазмоўнага і поўнага выкананьня прамфінпляну па ўсіх паказальніках. Падрыхтоўчая работа да перавыбараў і справаздачна-перавыбарчая кампанія павінны мабілізаваць партыйныя масы на неадкладную ПОЎНУЮ, РЭАЛІЗАЦЫЮ ПАСТАНОВЫ ЦК УсеКП(б) *) аб партыйнай і масавай рабоце ў цэху і брыгадзе.

У гэтай пастанове даюцца выразныя канкрэтныя дырэктывы па актуальнейшых пытаньнях партыйнай і масавай работы на вытворчасьці, накіраваныя на далейшае павышэньне ролі і ўдзелу партыйных арганізацый ва ўсім гаспадарча-палітычным жыцьці прадпрыемстваў. Праведзеная ў асноўным перабудова партработы на прадпрыемстве патрабуе далейшага ўдасканаленьня, далейшага паляпшэньня і канкрэтызацыі кіраўніцтва з боку парт'ячэек вытворчым жыцьцём, такой расстаноўкі партыйных сіл, якая забясьпечвала-б больш шырокі партыйны ўплыў на работу асноўных нізавых вытворчых зьвеньняў, у якіх у канчатковым ліку вырашаецца выкананьне прамфінпляну.

ЦК УсеКП(б) СВАЕЙ ПАСТАНОВАЙ ПАТРАБУЕ АД ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЯЎ ПОЎНАГА ВЫКАНАНЬНЯ ДЫРЭКТЫЎ XVI ПАРТЗЬЕЗДУ АБ ПАГАЛОЎНЫМ УЦЯГНЕНЬНІ УСІХ КАМУНІСТАЎ І КАМСАМОЛЬЦАЎ У САЦСПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА. Імкаш і быць ня можа. Кожны камуніст, кожны камсамолец на прадпрыемстве павінен у першую чаргу падаваць узоры камуністычных адносін да працы.

Зараз, як правіла, амаль на кожным прадпрыемстве партколектывы лічаць, што партыйцы і камсамольцы на 100 проц. ахоплены сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам. На справе-ж на некаторых прадпрыемствах ня ўсе партыйцы і камсамольцы працуюць сапраўды ўдарнымі мэтадамі, хаця і лічацца ўдарнікамі. Самаправерка сапраўднага выкананьня ўзятых абавязкаў у парадку сацспаборніцтва і ўдарніцтва павінна быць сыстэмай у рабоце вытворчых партарганізацый. Трэба рашуча весьці барацьбу з іншэ-ўдарніцтвам, у першую чаргу сярод камуністаў і камсамольцаў, забясьпечваючы гэтым самым далейшае пашырэньне і замацаваньне сацыялістычных мэтадаў працы на прадпрыемствах.

Арганізуючы актыўнасьць і творчую ініцыятыву мас на вытворчасьці, партыйныя арганізацыі павінны забясьпечваць сваёй работай поўнае ПРАВЯДЗЕНЬНЕ АДЗІНАНАЧАЛЬЛЯ, весьці барацьбу з усякімі скажэньнямі дырэктыў партыі і гэтым пытаньні. «ЦК ПРАПАНУЕ ЛІКВІДАВАЦЬ І Ў БУДУЧЫМ НЕ ДАПУСКАЦЬ АРГАНІЗАЦЫІ РОЗНЫХ «ШТАБАЎ». І «НАДЗВЫЧАЙНЫХ КАМІСІЯ» ПРЫ ПАРТКОМАХ І ЯЧЭЙКАХ, ШТО ПАДМЯНЯЕ ГАСПАДАРЧАЕ КІРАЎНІЦТВА І ЯГО АПЭРАЦЫЙНА - ТЭХНІЧНЫЯ ФУНКЦЫІ І ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ГРУБЫМ ПАРУШЭНЬНЕМ АДЗІНАНАЧАЛЬЛЯ».

Пытаньне аўладаньня тэхнікай, якая «ў пэрыяд рэканструкцыі вырашае ўсё»—важнейшая задача. На рэалізацыю гэтай дырэктывы, на аўладаньне тэхнікай вытворчасьці, партыйцамі і камсамольцамі, усімі рабочымі і кіруючымі кадрамі прадпрыемства павінна быць мабілізавана ўся пралетарская грамадзкасьць і выкарыстаны ўсе магчымасьці на мясцох. Павышэньню вытворчай кваліфікацыі рабочых і кіруючых кадраў, рацыяналізацыі тэхнічнай рэканструкцыі, мабілізацыі творчай актыўнасьці мас на пасьпяховае выкананьне ўсіх вытворчых задач павінна быць падпарадкавана ўся работа партыйных арганізацый на прадпрыемстве.

У адпаведнасьці з задачамі пераняцьня цяжару масавай работы ў нізавыя вытворчыя зьвеньні трэба ўсюды правесьці разбуйненьне цэхавых ячэек і пашырыць сетку партгруп. Асаблівую ўвагу павінны аддаць вытворчыя парторганізацыі задачам паляпшэньня абслугоўваньня вячэрніх і начных зьмен, забясьпечваючы гэтыя зьмены кіруючымі кадрамі з таварышоў, якія цьвёрда праводзяць у сваёй рабоце генеральную лінію партыі. Арганізацыйная перабудова партзьвеньняў павінна быць закончана ў самы бліжэйшы тэрмін. Поўнае завяршэньне перабудовы партыйнай работы на вытворчасьці, у адпаведнасьці з пастановай ЦК, барацьба па выкарчоўваньні апартуністычнай практыкі—зарука далейшых посьпехаў у змаганьні за выкананьне прамфінпляну, за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады.

*) Гл. газ. «Правда» № 83, «Зьвязда» № 84.

Асноўныя элемэнты перабудовы партработы на прадпрыемстве

Пачалася падрыхтоўка да перавыбараў кіруючых партыйных органаў на прадпрыемствах. Гэтыя перавыбары павінны ўнесьці ў адпаведным сэнсе пералом у перабудову работы вытворчых парткалектываў і ячэек.

Мы часта і многа гаворым аб перабудове партыйнай работы, але, на-жаль, у радзе месц справа не пасоўваецца наперад, застаюцца толькі гутаркі. На практыцы мы часта маем адрыў «перабудовы» работы ад тых задач, якія стаяць перад партыйнай арганізацыяй на прадпрыемстве. У мінулым годзе мы мелі такое становішча, калі ўсю перабудову партыйнай работы па многіх прадпрыемствах зьвялі толькі да арганізацыі сэктараў пры бюро парткалектываў і цэхавых ячэек. Кепская перабудова работы ў значнай меры тлумачыцца невыкананьне прамфінпляну за 1930 г. і прарывы па радзе прадпрыемстваў за першы квартал бягучага году.

Важнейшая задачай кожнай партыйнай арганізацыі на прадпрыемстве зьяўляецца мабілізацыя ўсіх сіл і сродкаў, каб забясьпечыць поўнае выкананьне прамфінпляну. Плян за 1930 г. мы ня выканалі таму, што «не хапіла ўменьня скарыстаць магчымасьці, якія ў нас ёсьць, не хапіла ўменьня правільна кіраваць заводамі, фабрыкамі, капальнямі». (Сталін, Аб задачах гаспадарнікаў). Факт, што многія нашы партыйных арганізацый і кіраўнікі прадпрыемстваў ня ўмеюць паляпшаць, арганізоўваць правільнае кіраўніцтва на прадпрыемстве ,няма нічо патрэбнай канкрэтнасьці ў кіраўніцтве, выразнасьці і гібкасьці ў рабоце.

Прамфінплян за 1931 год, асабліва якасныя паказальнікі, нельга выканаць, калі мы рашуча не палепшым работу па мабілізацыі ўнутраных рэзэрваў пэрадпрыемства. Што значыць мабілізаваць свае ўласныя, ўнутраныя рэсурсы і рэзэрвы? Мабілізаваць унутраныя рэзэрвы—г. зн. загрузіць лепш кожны варштат, павысіць прадукцыйнасьць працы, рацыянальна скарыстаць кожную адзінку сырцу, паўфабрыкату. Мабілізаваць рэзэрвы,—г. зн. паменшыць выдатак апалу, каляровых мэталяў, лепш скарыстаць адкіды, заводзкую і фабрычную плошчу. Нельга палепшыць якасьці прадукцыі і вынізіць сабекошт, калі мы ня будзем лепш працаваць, эканомней траціць нашы рэсурсы.

Мы гаворым аб неабходнасьці сацыялістычнай рацыяналізацыі, тэхнічнай рэканструкцыі, навуковай арганізацыі працы, а гэта значыць—неабходнасьці арганізаваць унутры - заводзкае плянаваньне хутчэй уводзіць стандарты, пашпартызаваць варштаты і ўсё абсталяваньне. Мы павінны дабіцца зьмяншэньня браку, больш рацыянальнай канструкцыі машын, вопраткі, ваконных рамы, бутэлькі. Калі паглядзець пратаколы парткалектываў, бюро ячэек, то мы на ўсе гэтыя пытаньні ня знойдзем адказу. Гэтымі пытаньнямі, як правіла, не займаюцца, зусім мала займаюцца справамі правядзеньня гаспадарчага разьліку, адзінаначальня. Ад вырашэньня іменна гэтых пытаньняў залежыць забясьпечэньне выкананьня як колькасных, так і якасных паказальнікаў. Такім чынам важнейшай часткай перабудовы партыйнай работы на прадпрыемстве зьяўляюцца паварот, карэнны перапом партыйнай увагі да пытаньняў тэхнічнай рэканструкцыі і сацыялістычнай рацыяналізацыі.

Падамо некалькі прыкладаў як ня трэба працаваць. На западкавай фабрыцы ў Рэчыцы машына давала шмат браку. Адзін таварыш патаемна зрабіў паляпшэньне ў машыне, пасьля чаго брак значна зьменшыўся. Гэтага «нартызана» рацыяналізацыі цэлы месяц трымалі пад пагрозай суда за тое, што ён самачынна «сапсаваў» замежную машыну. Нядобра зрабіў гэты таварыш, калі ён узяўся перарабіць машыну без дазволу. Але калі і трэба аддаць пад суд, дык перш за ўсё тых, якія стварылі такія абставіны, што каштоўныя паляпшэньні ў машыне, паляпшэньне якое вядзе да зьмяншэньня браку, павінна рабіцца патаемна.

Другі факт. На нарадзе вытворчых вязок пры ЦК, сакратар парткалектыву Віцебскай шэйнай фабрыкі выступіў з абвінавачаньнем ВСНГ у тым, што ён не даслаў норм выдатку нафты для іх рухавіка, а таму яны, быццам, не змаглі арганізаваць выдатканьня нафты. Сьмехатворны напрок, ці-ж на месцы нельга было дабіцца ўстанаўленьня норм эканомнага выдатканьня.

І далей. На значнай колькасьці прадпрыемстваў існуюць нясталыя зьмены і брыгады. Нясталая зьмена — гэта стапая бездапаказнасьць, гэта хаос ва ўсёй рабоце прадпрыемства, цэху, брыгады. Калі на Рэчыцкай запалкавай фабрыцы арганізавалі партыйныя групы ў нясталых зьменах, то на-заўтра аказалася, што няма ніякіх партгруп. Усё перамянялася, таму што няма сталых брыгад, сталых зьмен. Калі выступілі на парадзе вытворчых ячэек пастанову аб стварэньні сталых зьмен і брыгад, большасьць сакратароў упарта выступала супроць гэтага мерапрыемства. Доказаў у карысьць арганізацыі сталых зьмен і брыгад яны не хацелі аразумець.

Аб чым сьведчаць усе гэтыя факты? Гэтыя факты сьведчаць перш за ўсё аб тым, што нашы партыйныя арганізацыі на прадпрыемствах кепска займаюцца канкрэтнымі пытаньнямі вытворчасьці і, што мы павінны зараз асабліва падкрэсьліць — вусім кепска займаюцца пытаньнямі тэхнікі вытворчасьці. Перабудова партработы на прадпрыемстве павінна перш за ўсё заключацца ў тым, каб партыйныя арганізацыі заводу, кожная ячэйка, кожная партыйная група—усе замяліся-б пытаньнямі сацыялістычнай рацыяналізацыі, арганізацыі працэсаў вытворчасьці. За партыйнае кіраўніцтва тэхнікай на прадпрыемстве. — вось чым павінна вызначацца перабудова работы вытворчых партарганізацый.

Неабходна, каб партыйная арганізацыя на прадпрыемстве прапрацоўвала пытаньні рацыяналізацыі вытворчасьці і тэхнічнай рэканструкцыі. Партарганізацыя на прадпрыемстве павінна кіраваць ажыцьцяўленьнем мерапрыемстваў па рацыяналізацыі вытворчасьці і ажыцьцяўляць кантроль над выкананьнем гэтых задач. Работа вытворчых нарад, ударных брыгад, сацспаборніцтва павінна быць накіравана ў бок хутчэйшага выкананьня задач рацыяналізацыі, на мабілізацыі ўнутраных рэзэрваў. Трэба арганізаваць спэцыяльныя кантрольныя пасты, «скізозныя» брыгады, вынаходніцкія гурткі. Асаблівую ўвагу неабходна зьвярнуць на пытаньне ўзмацненьня тэхнічнага кіраўніцтва цэхамі, зьменамі, брыгадамі. Плян работы партарганізацыі, пачынаючы з парткому, бюро парткалектыву і канчаючы партгрупай, павінен уключыць у сябе канкрэтныя пытаньні ажыцьцяўленьня мерапрыемстваў па сацыялістычнай рацыяналізацыі і тэхнічнай рэканструкцыі, мабілізацыі рэзэрваў.

Важнейшай часткай перабудовы партыйнай работы ў гэтым напрамку зьяўляецца задача «аўладаньня тэхнікай». Выкананьне вышэйказаных задач патрабуе адпаведнай сумы тэхнічных ведаў, — аўладаньня тэхнікай. Пытаньне аўладаньня тэхнікай складаная і цяжкай задача, але «няма тэй цытадэлі, якую-б не ўзялі бальшавікі». Мы да гэтага часу не раскалыхаліся ў справе рэалізацыі лёзунгу г. Сталіна аб аўладаньні тэхнікай. Слабае разгортваньне работы на аўладаньні тэхнікай прымушае трывожыцца за тэмпы павароту партарганізацый тварам да пытаньняў тэхнікі. Перабудова партыйнай работы зараз адзначае арганізацыю разгорнутай барацьбы за аўладаньне тэхнікай усімі рабочымі, усімі камуністамі і, у першую чаргу, актывам. Колькі сакратароў ячэек, фабзавмясцкомаў чытаюць сыстэматычна спэцыяльныя часопісі, колькі з іх маюць і карыстаюцца спэцыяльнай літаратурай? Зусім мала. Пытаньне аб аўладаньні камуністамі тэхнікай, гэта пытаньне забесьпячэньня кіруючай ролі партыйнай арганізацыі на вытворчасьці ва ўсім сацыялістычным будаўніцтве.

Такім чынам рашучае паляпшэньне вымеру работы, поўнае прыстасаваньне яе адпаведна задачам, якія стаяць на прадпрыемстве, зьяўляецца асновай перабудовы партыйнай работы. Спопрацантнае выкананьне прамфінпляну абавязвае ўзяцца рашуча за пытаньне мабілізацыі ўнутраных рэзэрваў, за аўладаньне тэхнікай. Вырашэньне гэтых задач зьвязана з разгорнутай барацьбой супроць клясавых - варожых, апартуністычных скажэньняў лініі партыі. Трэба прадбачыць, што мы сустрэнемся з супраціўленьнем клясава варожых элемэнтаў, апартуністаў, калі па сапраўднаму возьмемся за кіраўніцтва тэхнікай, магчыма, што мы сустрэнемся з такімі гутаркамі: «раней аўладай тэхнікай, а потым бярыся за кіраўніцтва». Усе гэтыя спробы цягнуць нас назад—да пройдзенага этапу — павінны сустрэць самы жорсткі адпор з боку ўсёй партарганізацыі, усіх рабочых.

Задачы выкананьня пляну 3-га году пяцігодкі абавязваюць нас узмацніць партыйнае кіраўніцтва на прадпрыемстве. Узмацненьне партыйнага кіраўніцтва на прадпрыемстве павінна ісьці перш за ўсё па лініі ахоны і забесьпячэньня партыйным кіраўніцтвам такога важнага вучастку, як мабілізацыя рэзэрваў, сацыялістычная рацыяналізацыя і тэхнічная рэканструкцыя.

А. ТАНХІЛЕВІЧ.

Вопыт парткалектыву зав. „Бальшавік“

У пачатку другога году пяцігодкі чырвонасьцяжны завод «Бальшавік» (Менск) сыстэматычна ня выконваў за першыя 5 месяцаў свайго прамфінпляну, даваў вялікі процант браку. Прычынай гэтаму было мінулае апартуністычнае кіраўніцтва, якое замест таго, каб мабілізаваць масы на ліквідацыю прарываў, імкнулася вытлумачыць іх «аб'ектыўнымі прычынамі». Менскі акругком тады нанёс рашучы ўдар па правых апартуністычнай практыкі ў рабоце кіруючых работнікаў на заводзе «Бальшавік».

У сакавіку мінулага году на заводзе разгарнулася ўзмоцненая мабілізацыя мас на змаганьне з прарывамі ў выкананьні прамфінпляну. Пасьпяховае не правядзеньне патрабавала карэннай перабудовы сыстэмы партработы на прадпрыемстве. Парткалектыў паставіў задачу перанесьці ўвесь цяжар работы непасрэдна ў вытворчыя брыгады з тым, каб дабіцца такога кіраўніцтва, якое-б было найбольш гібкім, канкрэтным апэрацыйным, якое забясьпечвала-б сваячасовую мабілізацыю мас вакол асноўных задач, пастаўленых партыяй перад заводам «Бальшавік».

У перабудове партыйна-масавай работы на нашым заводзе мы выходзілі з неабходнасьці павярнуць усю партарганізацыю тварам да выкананьня тых задач, якія пастаўлены ўсёй палітычнай партыі, на максымальнае разгортваньне бальшавіцкіх тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. Асноўным партыйным зьвяном мы зрабілі партыйную групу. Пры арганізацыі партгруп выходзілі з прынцыпу забесьпячэньня кожнай вытворчай брыгады парткіраўніцтвам. Адначасова пры арганізацыі груп парткалектыў строга прытрымліваўся вытворчай структуры заводу. Там, дзе існуе вытворчая брыгада, была арганізавана і партыйная група. Давялося зрабіць толькі такое абмежаваньне: там, дзе ёсьць зусім раздробленыя працэсы вытворчасьці, у якіх занята менш 5 рабочых, самастойная партыйная група не арганізавалася, а злучаліся дзьве блізкалежных у сваіх вытворчых працэсах і арганізоўвалася адна партыйная група. Там-жа, дзе было 5 і больш рабочых, арганізоўвалася партгруппа самастойная. Партыйны арганізатар, як правіла, выбіраўся там, дзе ёсьць ня менш трох членаў партыі, ва ўсіх іншых выпадках партарганізатар вылучаўся бюро парт'ячэйкі і зацьвярджаўся на агульным сходзе. З наўпрыс на нашым заводзе 50 групоргаў зьяўляюцца выбранымі на партгрупах 21 чал., а рэшта — вылучаны бюро цэхячэек. У выпадку, калі ў тэй ці іншай вытворчай брыгадзе рабочых зусім ня было партыйцаў, мы ў парадку прарыўнай расстаноўкі партыйных сіл практыкавалі перакідку партыйцаў з другіх брыгад. Так іменна было з жалезнавым цэхам.

Перад партгрупамі мы ставілі наступную задачу: яна пісе поўную адказнасьць за выкананьне партыйных дырэктыў у сваёй брыгадзе. Сваёй работай партгрупа павінна забясьпечыць павышэньне практычнага ўдзелу камуністаў і рабочых сваёй брыгады ў арганізацыі вытворчасьці, разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва, паляпшэньні якасьці прадукцыі, павышэньні прадукцыйнасьці працы, увядзеньні працоўнай дысцыпліны, рацыяналізацыі працэсаў вытворчасьці і барацьбе са стратамі. Побач з гэтым партыйная група павінна забясьпечыць уцягненьне ленных ударнікаў у рады нашай партыі.

За апошнія 3-4 месяцы партгрупы прапрацавалі рад асноўных важнейшых пытаньняў. Перш за ўсё партгрупы прапрацавалі пытаньне аб чарговых задачах парткалектыву.

Разам з гэтым партгрупы правяралі выкананьне тарабавязкаў і грамадзкіх нагрузак усімі членамі партыі і камсамольцамі сваіх брыгад. Прапрацавалі пытаньне аб стане партыйнай вучобы, а таксама аб вярбоўцы ў партыю перадавых рабочых-ударнікаў. Гэта апошняе пытаньне ставілі ня толькі з яго прынцыповага боку, а канкрэтна і практычна: каго партгрупа лічыць магчымым і неабходным у бліжэйшы час завербаваць у партыю. Гэтым самым была забясьпечана штодзённая сыстэматычная работа ў галіне росту партыі. Нарэшце, партгрупы абмеркавалі пытаньне аб ролі камуніста на вытворчасьці. Абмеркаваньне гэтага пытаньня, канкрэтнае выяўленьне, як кожны камуніст выконвае сваю норму выпрацоўкі, якую якасьць прадукцыі дае і які ўдзел прымае ў рацыяналізацыі — значна павысіла адказнасьць кожнага камуніста за сваю работу каля варштату.

Усяго ў нашым парткалектыве 50 партгруп, прычым яны разьмяркоўваюцца па асобных цэхах самым розным парадкам. Самая вялікая колькасьць партгруп (18) прыпадае на другі хромалы цэх, і самая меншая — на склад сырцу (4 партгрупы).

Каб забясьпечыць належнае кіраўніцтва партгрупамі, сакратар цэх'ячэйкі, апрача штодзённага нагляду за работай, раз у месяц зьбірае сваіх партарганізатараў і праводзіў з імі інструкцыйныя нарады. Арганізацыя партгруп дала магчымасьць прыцягнуць да кіраўніцтва работы шырокае кола партыйцаў. У результаце перабудовы партработы значна павысілася ідэйная ўстойлівасьць партыйнай арганізацыі. Партгрупа навучылася ўзьпімаць штодзённую практычную работу на вышыню палітычных задач змаганьня за генеральную лінію партыі. Партгрупе ў большай ступені, чым цэх'ячэйцы ўдалося мабілізаваць увагу рабочых вакол задач змаганьня за ажыцьцяўленьне пастаноў партыі.

Па такім-жа прынцыпе партарганізацыі перабудавана ўся работа і фабзаўкамскому. Асноўным прафсаюзным зьвяном на заводзе стала вытворчая брыгада, якая выбірала сваёго прафарганізатара. Брыгада вырашае ўсе пытаньні, зьвязаныя са змаганьнем за прамфінплян з гаспадарча-палітычнымі кампаніямі, якія праводзяцца на заводзе. Паколькі мы ўвесь цэнтр цяжару змаганьня за прамфінплян перанесьлі на вытворчую брыгаду, мы там арганізавалі і нізавы трыкутнік, які складаецца з групавога парторга, прафорга і майстра аддзяленьня.

У результаце перабудовы партработы мы дасягнулі таго, што праграма ўдарнага кварталу, якая была павышана параўнальна з 1929-30 годам на 11 проц., была выкавана на 106 проц.

252 ударнікі заводу добраахвотна зьнялі расцэнкі, што дало 10.800 руб. Шырокім патокам пашлі рабочыя рацыяналізатарскія прапановы. Ажыцьцяўленьне 20 рабочых прапаноў дало эканоміі 16.659 руб. 80 кап. Процант зьніжэньня сабекошту за ўдарны квартал складае 8,79, замест 8,03 проц., якія прадугледжваліся плянам. Гэты высокі процант зьніжэньня сабекошту быў магчымы толькі на аснове павышэньня якасьці прадукцыі. Значна зьнізіліся прагулы.

Даволі значныя рэзультаты росту працы за ўдарны квартал. Уцяшэнне ў нашы рады 48 ленных ударнікаў. Усе яны з вялікім вытворчым стажам. У трэці год пяцігодкі завод уступіў падрыхтаваным і ў асноўным спраўляецца з сваімі задачамі. За першыя два месяцы бягучага году завод выканаў свой прамфінплян на 101 проц. у колькасных паказальніках і на 103 проц. у цэнавым выражэньні.

Вязумоўна, разам з вялікімі посьпехамі завод мае рад недахопаў. Невыстарчальна значна разгорнута культурна-масавая работа, работа сярод жанчын, не выкарыстаны значна ўсе магчымасьці для павышэньня якасьці прадукцыі. Чад зьнішэньнем гэтых недахопаў і працуе ўся партарганізацыя.

Практыка работы нас упэўніла ў тым, што без рашучай перабудовы ўсёй нашай партработы, без перанясеньня ўсёй работы ў брыгады завод ня змог-бы з такім посьпехам спраўляцца з выкананьнем асноўных задач.

ДЗЯЦІНА.

Шырэй фронт завочнага навучаньня

Пралетарыят і працоўныя масы нашай краіны вядуць пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі пасьпяховую тэрміновую барацьбу за завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР, за поўнае выкананьне задачы «дагнаць і перагнаць» перадавыя капіталістычныя краіны ў тахніка-эканамічных адносінах», задачы, якую мы павінны вырашыць на працягу дзесяці год. У прамысловасьці задача «хто—кого» вырашана канчаткова на карысьць сацыялізму. Пралетарыят, апіраючыся на сваю асноўную і галоўную апору ў вёсцы—на калгаснае сялянства, у саюзе з масамі беднаты і серадняцтва—адна-асобнікаў, якія падтрымліваюць калгасны рух і дапамагаюць пралетарыяту весьці рашучую барацьбу з кулаком, пасьпяхова вырашае задачу сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, шляхам суцэльнай калектывізацыі, ліквідуючы на гэтай базе кулацтва як клясу.

Сацыялістычнае наступленьне, якое шырока разгарнулася па ўсім фронце, вымушкала абвастраньне клясавай барацьбы. У барацьбе за ленінізм, за генеральную лінію, у барацьбе на два фронты, з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, з рэшткамі контр-рэвалюцыйнага трацкізму, з «лева-левацкім» блёкам, з «левым» заскокам», у гарніле жорсткіх, клясавых бояў кампартыя ня толькі загартавала свае сталёвыя рады вакол свайго ленінскага Цэнтральнага Камітэту, узьняла свой палітычна-ідэйны ўзровень, але і ўзмацніла ўсю сваю арганізацыйна-масавую работу.

Большай ступені ўзброілася рэвалюцыйнай марксыцка-ленінскай тэорыяй.

Вялізарныя і адказнейшыя задачы пэрыяду сацыялізму, пэрыяду разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце, нязвычайных тэмпаў, вялікага ўздыму творчага энтузіязму, з якім шырачайшыя шматмільённыя масы рабочых, працоўных нашай краіны, працуюць над ажыцьцяўленьнем лёзунгу рэканструкцыйнага перыяду—«Пяцігодку—за чатыры гады», пэрыяд абвостранай клясавай барацьбы—выклікаюць неабходнасьць у значна большай ступені разгортваньня паходу на марксыцка-ленінскай тэорыяй, поўнага аўладаньня ня толькі ўсёй партыйнай арганізацыяй, але і пашырэйшымі масамі беспартыйных рабочых, калгасьнікаў гэтай магутнай зброяй за справу перамогі сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

Сусьветны капіталізм шалёна рыхтуецца да нападу на краіну дыктатуры пралетарыяту—СССР. Ён, як і клясавы вораг укутры нашай краіны, ліквідацыя мабілізуе ўсе, у тым ліку і свае навуковыя і тэхнічныя сілы, каб скарыстаць іх у барацьбе з намі, каб сарваць справу будаўніцтва сацыялізму у нашай краіне. Мы знаходзімся ў пэрыядзе надзвычайна ўзрослай небясьпекі нападу на нас сусьветнай буржуазіі.

Наша сацыялістычнае будаўніцтва на сваім шляху сустракаецца з труднасьцямі. Гэтыя труднасьці ёсьць труднасьці нашага росту. Пасьпяхова перамагаць іх—наша задача. Перамагаць іх—гэта значыць яшчэ больш павышаць тэарэтычны ўзровень партыйнай арганізацыі, беспартыйных рабочых мас, гэта значыць такімі тэмпамі разгарнуць тэарэтычную вучобу, каб пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб партвучобе былі поўнасьцю выкананы.

У пачатку сакавіка г. г. пры ЦК КП(б)Б адбылася нарада па пытаньнях партасьветы. Нарада канстатавала нізкае бальшыняе становішча партасьветы, са ўсёй рашучасьцю выкрыла недахопы, прагалы, і іх прычыны у разгортваньні партвучобы. Адной з асноўных прычын прагалаў у партвучобе зьяўляецца апартуністычная недаацэнка яе (партвучобы) а боку некаторых зьвеньняў партарганізацый. У гэтых мясцох таварышы не ўзялі сабе, што задачы партасьветы нельга адарваць ад задач ажыцьцяўленьня генеральнай лініі партыі, што нельга прадстаўляць сабе партасьвету, як нешта адарванае ад усёй партыйнай работы, што зараз асабліва актуальнае значэньне набывае ператварэньне тэорыі ў сапраўдную штодзённую зброю ў практычнай рабоце.

У сыстэме партыйнай вучобы завочнае навучаньне займае значнае месца. Задача ўзбраеньня марксыцка-ленінскай тэорыяй ёсьць задача кожнага партыйца, камсамольца, беспартыйнага рабочага, калгасьніка. Існуючая сетка партасьветы ня зможа поўнасьцю ахапіць усю партыйную, камсамольскую арганізацыі, асабліва актыву. У дапамогу сетцы партасьветы, для пасьпяховага вырашэньня задачы тэарэтычнай вучобы актыву, які ў значнай частцы нельга на доўгі час адарваць ад практычнай работы і накіраваць на вучобу, і прыйшла сыстэма завочнага навучаньня. Яна дасьць магчымасьць партыйна-камсамольскаму актыву, не адрываючыся ад такой важнай справы, як практычнае кіраўніцтва сацыялістычным будаўніцтвам, узброіць вадаю рэвалюцыйнай тэорыяй, спазнаючы яе в вырашэньнем практычных задач сацыялістычнага будаўніцтва. Таму, задача партыйных арганізацый—змагаючыся на-бальшавіцку з выпрадзеньнем правалаў у партасьвеце, зьвярнуць асаблівую увагу на завочнае навучаньне, папулярызуючы яго сярод шырокіх партыйных мас, стараючы спрыяючыя ўмовы для вучобы завочнікам.

Пастановай сакратарыяту ЦК КП(б)Б пры ЦК арганізаваны Інстытут масавага завочнага навучаньня. Стварэньне інстытуту—гэтага кіруючага цэнтру завочнага навучаньня—дасьць магчымасьць хутчэй і лепш выправіць недахопы ў сістэме завочнага навучаньня і дастаўіць на належную вышыню арганізацыйнае, навучальна-мэтадычнае і ідэйна-палітычнае кіраўніцтва, стварае праслаўныя арганізацыі новых форм навочнага навучаньня. Паводле пастановы сакратарыяту ЦК КП(б)Б, кантынгент партыйна-камсамольскага актыву, які павінен быць ахоплен сыстэмай завочнага навучаньня, вызначаецца ў 7.000 чалавек. Зь выкананьнем гэтай кантрольнай лічбы партыйныя арганізацыі павінны змагацца. Гэтая кантрольная лічба рашуча стаіць пытаньне аб удзяленьні большай увагі справе арганізацыі завочнага навучаньня.

Вялікую ролю ў завочным навучаньні павінна адыграць радыё. Яно паўпна зрабіцца галоўным зьвяном у сыстэме завочнага навучаньня. Уключэньне радыё ў сыстэму завочнага навучаньня вырашае цэлы рад труднасьцяй. Яно дае магчымасьць, перамагаючы адлегласьці, сканцэнтраваць лепшыя кваліфікаваныя сілы ў адным цэнтры, палепшыць гэтым самым якасьць прадукцыі выкладчыкаў. Яно будзе прыцягваць завочнікаў да рэгламэнту часу сваёй занятку, будзе прымушаць завочнікаў працаваць больш гуткімі тэмпамі, уносіць адзінства, плянавасьць, сыстэму у работу як завочных устаноў, так і самых завочнікаў. Партыйным арганізацыям трэба поўнасьцю рэалізаваць пастанову ЦК КП(б)Б аб арганізацыі асобных радыёвузлоў, забесьпячэньне іх праз радыёцэнтр патрэбнай колькасьцю радыёапаратуры, прыладамі, аб адпаведнай, разгрузцы актыву і інш.

Стварэньне інстытуту масавага завочнага навучаньня дасьць магчымасьць скарыстоўваючы радыё, шырай папулярызаваць завочнае навучаньне, лепш перабудаваць усю сыстэму завочнага навучаньня «тварам да гаспадарчай адпаведнасьці рэчаў», да спэцыялізацыі іх, шырай папулярызаваць работу мясцовых партыйных арганізацый па разгортваньні масавага завочнага навучаньня, іх адносіны да гэтай важнай справы, моцна ўдарыць па апартуністычнай недаацэнцы партвучобы ў пасобных мясцох, па абломаўшчыне і г. д.

Перад Інстытутам масавага завочнага навучаньня ЦК КП(б)Б пастаўлены рад адказнейшых задач. Выконаць іх Інстытут павінен шляхам разгортваньня на гэтым участку сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, шляхам прыцягненьня да работы на фронце завочнага навучаньня лепшых тэарэтычных партыйных сіл, шляхам уняцьня ў праграму завочнага навучаньня, побач з палітычнымі дысцыплінамі, і элемэнтаў тэхнікі, шляхам шырокага скарыстаньня радыё ў злучэньні з адпаведнай выдавецкай дзейнасьцю.

Усё гэта дасьць магчымасьць узьняць на вышэйшую ступень справу падрыхтоўкі партыйных кадраў, на вышыню адпаведную запатрабаваньням рэканструкцыйнага перыяду.

С. Рычкоў.

Дарогу пасеўным грузам!

Зрыў перавозак пасеўных грузаў—удар па сацыялістычным зямляробстве

ВОДНІКІ АБЯЦАЮЦЬ — ФЛЁТ БУДЗЕ ПАДРЫХТАВАНЫ

ЦК КП(б)Б, ЦК УсеКП(б), „ЗЬВЯЗЬДЗЕ“

1-шы РАЁННЫ ЗЬЕЗД ВОДНІКАЎ БССР, САБРАЎШЫСЯ ДЛЯ АБГАВАРЭНЬНЯ ПЫТАНЬНЯЎ, ЗЬВЯЗАНЫХ З ПРАКТЫЧНЫМ ВЫКАНАНЬНЕМ ПАСТАНОВЫ ЦК І СНК АБ РЭКАНСТРУКЦЫІ РЭЧНАГА ТРАНСПАРТУ І ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА НАВІГАЦЫІ, УХВАЛЯЕ ПОЎНАСЬЦЮ МЕРАПРЫЕМСТВЫ ПАРТЫІ ПА РЭКАНСТРУКЦЫІ ВОДНАГА ТРАНСПАРТУ І ВЫКАНАНЬНІ ЗАДАЧ, ЯКІЯ СТАЯЦЬ ПЕРАД ТРЭЦІМ РАШАЮЧЫМ ГОДАМ ПЯЦІГОДКІ.

ДЭЛЕГАТЫ ЗЬЕЗДУ АБВШЧАЮЦЬ СЯБЕ ЎДАРНІКАМІ Ў СПРАВЕ ПРАКТЫЧНАЙ РЭАЛІЗАЦЫІ АДОЗВЫ ЦК І СНК, ЗЬЕЗД АД ІМЯ 3.000 РАБОЧЫХ - ВОДНІКАЎ ЗАЯЎЛЯЕ, ШТО ФЛЁТ ДА НАВІГАЦЫІ БУДЗЕ ПОЎНАСЬЦЮ ПАДРЫХТАВАН, ПЛЯНЫ ПЕРАВОЗК БУДУЦЬ ВЫКАНАНЫ І АБЯЦАЮЦЬ ВЕСЬЦІ РАШУЧУЮ БАРАЦЬБУ З ПАНІКЁРСТВАМ І АПАРТУНІЗМАМ У РАБОЦЕ ТРАНСПАРТУ.

ПРЭ

САЦЫЯЛІСТЫЧНАМУ ІЛЬНАВОДЗТВУ—МОЦНУЮ ТЭХНІЧНУЮ БАЗУ

З новымі сіламі, з накопленым вопытам—наперад па шляху сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі

прамова тав. ГАЛАДЗЕДА на III Усебеларускім зьезьдзе калгасаў

Таварышы! Дазвольце мне ад імя Савету Народных Камісараў перадаць зьезду будаўнікоў новай сацыялістычнай вёскі—калгасьнікам БССР—бальшавіцкае прывітаньне (воплескі).

Спыніўшыся на міжнародным становішчы, тав. Галадзед адзначае тую шалёную падрыхтоўку інтэрвэнцыі, якую вядуць імпэрыялісты супроць Савецкага Саюзу, і вызначае задачы ўмацаваньня абароназдольнасьці краіны. Далей тав. Галадзед пераходзіць да пытаньняў сацыялістычнага будаўніцтва СССР і БССР.

Мы зараз знаходзімся ў паласе ўступленьня ў перыяд сацыялізму—мы ўступілі ў гэты перыяд.

У нас, у савецкай дзяржаве, ва ўмовах пралетарскай дыктатуры мы задачу зжываньня супярэчнасьцей паміж гарадам і вёскай вырашаем з вялікім посьпехам, злучаем сацыялістычную эканоміку горада з сацыялістычнай эканомікай вёскі—у адзіную сацыялістычную эканоміку на базе індустрыялізацыі СССР.

Разьвіваючы нашу індустрыю, мы гэтым індустрыяльным вагаром цягнулі на шляху сацыялістычнага ператварэньня сельскую гаспадарку і змыкаем інтарэсы індустрыі з разьвіцьцём сельскай гаспадаркі. Тым самым узмацняецца саюз рабочае клясы з асноўнымі масамі сялянства. Тым самым мы далучаем мільёны, дзесяткі і сотні мільёнаў працоўных сялян да пераадраднага ўдзелу ў будаўніцтве сацыялізму.

Мы канкрэтна сталі на шлях ліквідацыі кляс. Разьмеры калектывізацыі і размах наваротку бядняцка-серадняцкага сялянства ў бок калектывізацыі—вялізнае сацыяльнае калектывізацыі—далі магчымасьць нашай партыі і савецкай уладзе стаць на шлях ліквідацыі кулацтва як кляснага, апошняга капіталістычнай клясы, апошняй надзеі капіталізму. Мы выкарчоўваем карэньні капіталізму. Але-ж гэта задача цяжкая. Кулацтва, якое ліквідуецца, налічвае ў сотні і тысячы раз свае супраціўленьне.

Умець знайсьці клясавага ворага, правільна разьлічваць тактыку ў барацьбе з ім, сваячасова і трапна наносіць яму паражэньне, адна з асноўных клясавых задач усяго пралетарыяту, усіх калгасьнікаў.

Калгасьнікі павінны адчуваць адказнасьць за тую сацыяльна-эканамічныя працэсы, якія адбываюцца на вёсцы. І калі калгасьнікі не разумеюць, што яны адказваюць за тую працу, якая праводзіцца ў вёсцы, гэта значыць, што такія калгасьнікі яшчэ няпоўнасьцю ўсьвядомілі свае задачы—задачы новага сацыялістычнага будаўніцтва.

Ня так лёгка даецца новае сацыялістычнае будаўніцтва. У нас часта ёсьць недахопы. Ёсьць рад труднасьцей.

Трэба не забываць таго, што і ў калгас яшчэ заносяцца перажыткі ранейшых індывідуалістычных настрояў, кулак іх палагравае, імкнучыся расхістаць калгасы. Ня ўсе яшчэ калгасьнікі пазбавіліся старых перажыткаў. Іх многа занесена ў калгас, відома, што іх ня так лёгка зжываць, але іх трэба зжываць і мы іх зжывём.

ПА-БАЯВОМУ СУСТРЭЦЬ БАЛЬШАВІЦКУЮ СЯЎБУ

Першачарговай задачай, якая стаіць перад усімі калгасьнікамі на сёньняшні дзень, зьяўляецца задача—па-баявому сустрэць і правесьці бальшавіцкую сяўбу—веснавую пасеўную кампанію. Пасьпяховае правядзеньне веснавой сяўбы асабліва і ў першую чаргу ў калгасах зьяўляецца адной з важнейшых і неадлучных частак усяго комплексу мерапрыемстваў па ажыцьцяўленьні трэцяга рашаючага году пяцігодкі і па ўсім сацыялістычным будаўніцтве.

Калі-б аказалася, што мы засеем вясной несвоечасова, або пакінем палі незасеянымі, гэта на справе азначала-б, што мы ў значнай частцы сарвалі-б выкананьне ўсяго народна-гаспадарчага пляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Пасьпяховае правядзеньне гэтай веснавой кампаніі з поўнай упэўнкай задач далейшай калектывізацыі ў разьмерах, вызначаных камуністычнай партыяй і савецкім урадам, будзе вырашаць задачы сапраўднага ажыцьцяўленьня лёзунгу камуністычнай партыі, што ў гэтым годзе мы павінны завяршыць пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі. Наша партыя і савецкі ўрад БССР вызначылі на 1931 год калектывізацыю 45 проц. бядняцка-сераднядкіх гаспадарак і з іх 30 проц. вясной. Мне думаецца, што і калгасьнікі нясуць вялікую адказнасьць за выкананьне гэтых задач.

Сваім прыкладам работы і прапаганды вы павінны ўцягваць новыя тысячы і мільёны бядняцка-сераднядкіх гаспадарак у калгасы як шляхам пашырэньня сваіх існуючых калгасаў, так і арганізацыяй новых. Вяла задача заключаецца ў тым, каб трымацца цьсьней з аднасобнікам—бедняком і сераднякам. Цягнеце гэтыя аднасобніка на буксіры ў калгас. Дапамагайце яму ламаць мясавыя традыцыі, якія часта вісяць на ім вялікім непатрэбным грузам. Разьбівайце клясава-варожую агітацыю кулака, які часта скарыстоўвае ўсякія слабыя месцы бедняка і сераднякі для таго, каб затрымаць яго ад уступленьня ў калгас. Адзіны выхад для падвышэньня становішча пралетарыяту, сялянства заключаецца ў аб'яднаньні дробных і драбнейшых гаспадарак у калгасы.

Калі мы армію калгасьнікаў ператворым у армію прапагандыстаў словам і справай, у армію арганізатараў новага калгаснага руху, то мы задачу сацыяльнай калектывізацыі да канца пяцігодкі поўнасьцю выканаем! (воплескі).

АЎЛАДАЦЬ САКРЭТАМІ ТЭХНІКІ І АГРАНАМІЧНАЙ НАВУКІ

Яшчэ адну канкрэтную задачу я хачу паставіць перад вамі—гэта пытаньне аўладаньня тэхнікай.

Лёзунг аўладаньня тэхнікай цалкам і поўнасьцю адносіцца і да сельскай гаспадаркі і, у першую чаргу, да калгасаў і да ўсіх калгасьнікаў. На зьезьдзе неабходна сёньня выкінуць лёзунг, каб калгасьнікі ва ўсёй сваёй масе на 100 проц. аўладалі тэхнікай і агранамічнай культурай. Кожны калгасьнік павінен стаць трактарыстам і машыністам.

Мы аб'ядналі мільёны бядняцка-сераднядкіх мас сялянства ў буйныя калгасныя гаспадаркі і ў гэтых калгасных гаспадарках ужываем і будзем ужываць тэхніку. Ужываньне тэхнікі і агранамічнай культуры ў шырокім маштабе магчыма толькі на збудаваных саўгасных і калгасных палёх і гаспадарках.

Кожны калгасьнік і рабочы саўгасу павінен аўладаць сакрэтамі тэхнікі і агранамічнай навукі, умець поўнасьцю скарыстоўваць тэхніку на саўгасных і калгасных палёх. Гэты лёзунг трэба зрабіць масавым. Кожны калгасьнік павінен сесьці на трактар і кіраваць ім. Дрэнны той калгасьнік, які ня думае быць трактарыстам. Гэта задача нялёгкая, але мы яе абавязкова выканаем.

Наша задача—адначасова з фармаваньнем новых кадраў савецкіх аграномаў і тэхнікаў ажыцьцявіць лёзунг, каб кожны калгасьнік і кожны рабочы самі зрабіліся аграномамі і тэхнікамі. Гэта вусім магчыма. Трэба, каб кожны калгасьнік, як перадавы элемэнт, аўладаў агранамічнай культурай і тэхнікай. Гэта магчыма і гэта неабходна. Мы павінны дабіцца чаго-б гэта ні каштавала. Толькі пры масавым укараненьні агранамічнай культуры і тэхнікі ў нашы калгасы, мы зможам хутчэй вырашыць задачы ўздыму сельскай гаспадаркі і цягнуць сельскую гаспадарку належнымі тэмпамі на шляху яе калектывізацыі, за тэмпамі разьвіцьця сацыялістычнай індустрыі.

Яшчэ адна практычная задача—гэта ўменьне берагчы машыны.

Трэба берагчы машыну для таго, каб мець ад яе больш карысьці: ня зможаш зьберагчы і добра яе даглядзець, не атрымаеш ад машыны патрэбнай карысьці.

БЕРАГЧЫ МАШЫНУ І ЎСЮ КАЛГАСНУЮ МАЕМАСЬЦЬ

Лёзунг—берагчы машыну, як і ўсю калгасную маемасьць, адносіцца да машыны і да ўсёй калгаснай маемасьці з пашэкай, з пагавай, бражніва, адносіцца па-новаму, па-калгаснаму—гэта адна з важнейшых канкрэтных задач, якія стаяць перад калгасьнікамі. Хто не шануе калгаснага добра, хто ня спрыяе калгасу, той марнатраўца, той падрывае і моц калгасу і моц нашай пралетарскай дзяржавы, падрывае будаўніцтва сацыялізму. Гэтага не павінен забываць ні адзін калгасьнік.

Вы, таварышы, пачалі вялікую справу, справу, якой ня бачыла гісторыя—справу арганізацыі буйной калектыўнай гаспадаркі. Дык умейце шанаваць гэту справу.

Апошняе, на чым я хачу спыніцца—гэта пытаньне арганізацыі працы. Вы тут заслухалі спэцыяльны даклад на гэтым пытаньні. Арганізацыя працы ў калгасах, разьмеркаваньне ўсіх прыбыткаў, у тым ліку і ўраджаю—па колькасьці і якасьці працы, а не па едаках,—гэта зьяўляецца асноўным і галоўным фактарам узмацненьня калгасаў. Гэта зьяўляецца галоўным элемэнтам у павышэньні вытворчых сіл калгасу. Гэта зьяўляецца галоўным элемэнтам, арганізуючым калгас. Зьдзельшчына і сацыяборніцтва ў шырокім маштабе—гэта галоўныя мэтады працы ў калгасах.

Чаму ня ўзяць прыклад з сельска-гаспадарчай арцелі «Камінтэрн», Уваравіцкага раёну. Там атрымаліся цікавыя вынікі пры ўвядзеньні зьдзельшчыны. На ўзараньне аднаго гэктара цаліны патрэбны былі да ўвядзеньня зьдзельшчыны 4 плугі ў дзень, пасьля ўвядзеньня зьдзельшчыны справіліся тры. Баранавалі ў адзін дзень толькі адзін гэктар, а пасьля, з увядзеньнем зьдзельшчыны, баранавалі ў дзень два гэкт.—павялічэньне ў два разы. Сяўба ручным спосабам да ўвядзеньня зьдзельшчыны—2,5 гэкт. засявалі, ужыл зьдзельшчыну—засявалі 4 гэкт. у дзень: тры чал. у дзень скошвалі 1 гэк. а ўвялі зьдзельшчыну—два чал. касілі 1 гэкт. Перавозка пэлны на адной фурманцы ў дзень да ўвядзеньня зьдзельшчыны складала 1.000 штук, а пасьля ўвядзеньня зьдзельшчыны — 2.000 шт. цэглы. У арцелі «Энгельс», Уваравіцкага раёну, ёсьць такія-ж вынікі. А вось прыведзены прыклад: у арцелі «Камінтэрн», Чэрыкаўскага раёну, няма зьдзельшчыны, няма правільнай арганізацыі працы, там няма цьвёрдага разьмеркаваньня працы, адсутнічае працадысцыпліна. Абагуленая жывёла не даглядаецца як сьлед і ў выніку ёсьць выпадкі падзяжу жывёлы.

У далейшай працы вашым галоўным лёзунгам павінна быць укараненьне правільнай арганізацыі працы,—зьдзельшчына, уменьне расстаўляць людзей, правільнае разьмеркаваньне прыбыткаў па колькасьці і якасьці працы. Дырэктывы партыі і савецкага ўраду, улічыўшы і ваш уласны вопыт, тады нашы калгасы будуць мацнець не на днёх а на гадзінах.

З новымі сіламі, з накопленым вопытам, пад кіраўніцтвам нашай партыі—вы, калгасьнікі, у нагу з пралетарыятам, пад яго гегемоніяй і далей пойдзеце па шляху сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі!

Няхай жыве камунізм!

Няхай жывуць калгасьнікі БССР і СССР! (Бурныя воплескі).

Пад масавы грамадзкі кантроль—усю работу па кантрактацыі тэхнічных культур

УЗМАЦНІЦЬ ПАДРЫХТОЎКУ ДА СЯЎБЫ У ІНДЫВІДУАЛЬНЫМ СЭКТАРЫ, ДАЦЬ ЦЬВЕРДЫЯ ЗАДАНЬНІ КУЛАКАМ

Выкарчуем правую практыку

ў справе кантрактацыі тэхкультур

Да адказнасьці крупскіх апартуністаў, якія зьменшылі на 50 проц. плошчу ільну і канапель

Выкананьне пляну пасеву тэхнічных культур залежыць выключна ад сваячасовай падрыхтоўкі адпаведных арганізацый да гэтай работы і ў першую чаргу ільнаканапляводчай каапэрацыі, калгаснай сыстэмы і органаў Наркамзему на месцах.

Калі сёньня паставіць канкрэтна пытаньне, на колькі падрыхтавалася калгасна-каапэрацыйная сыстэма і органы Наркамзему да правядзеньня гэтай работы, наколькі забясьпечана выкананьне пляну пасеву і кантрактацыі ільну і канапель як у калгасах, так і ў індывідуальным сэктары,—многія, з раённых арганізацый яснага адказу не дадуць.

Наадварот, пастанова СНК БССР аб веснавой сяўбе ў цэлым радзе раёнаў ня выконваецца. Асабліва характэрным у гэтых адносінах зьяўляецца КРУПСКІ РАЁН, дзе да гэтага часу рад адказных работнікаў разважаюць, што іх раён зьяўляецца малочна-жывёлагадоўчым. Больш таго, крупскія раённыя арганізацыі зьменшылі на 50 проц. плян пасеву ільну і канапель у калгасах, пераляжыўшы яго на індывідуальны сэктар, і такім чынам стварылі пэўную пагрозу зрыву пляну пасеву і кантрактацыі.

Крупскі раён замест таго, каб рашуча пастаўіць пытаньне аб калектывізацыі бядняцка-сераднядкіх мас вёскі, іх вытворчага каапэраваньня, ідзе па лініі найменшага супраціўленьня, якая тармозіць калектывізацыю і не забясьпечвае выкананьня пляну пасеву і кантрактацыі тэхнічных культур. Такія моманты маюць месца і ў некаторых іншых раёнах.

Гэтым праваапартуністычным тэндэнцыям трэба даць рашучы адпор. Апартуністы, якія зрываюць кантрактацыю і тармозяць калектывізацыю бядняцка-сераднядкіх гаспадарак, павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

Да веснавой сяўбы мы павінны мець 30 проц. калектывізаваных бядняцка-сераднядкіх гаспадарак вёскі, з гэтага разьліку складзены і пляны пасеву тэхнічных культур у калгасах. Ясна, пры зрыве пляну калектывізацыі будзе сарваны і плян пасеву ў калгасах. Таму ўся ўвага павінна быць зьвернута на калектывізацыю бядняцка-сераднядкіх гаспадарак і перарастаньне існуючых вытворчых таварыстваў у калгасы. Трэба неадкладна там, дзе гэта ня зроблена, у вытворчых таварыствах стварыць ініцыятыўныя групы па перабодзе іх па калгасныя формы вядзьлякарыстаньня і гэтым забясьпечыць плян калектывізацыі і веснавой сяўбы ў калгасах.

Звяртаючыся да выкананьня пляну кантрактацыі ільну і канапель на 20 сакавіка т. г., трэба сказаць, што адозва ЦК КП(б)Б і СНК БССР у часьці скананьня кантрактацыі яравых пасеваў да 1 красавіка, у тым ліку ільну і пяньку, знаходзіцца пад пагрозай. З 98 раёнаў, у якіх праводзіцца кантрактацыя ільну і канапель, з пачатку кампаніі кантрактацыі далі весткі аб сваёй рабоце толькі 72 раёны. З гэтага выпікае, што 26 раёнаў да 20 сакавіка ніякай работы не вядуць. У рэзультаце на 20 сакавіка плян кантрактацыі ільну выкананы на БССР у сярэднім на 11,1 проц., а па канопляхі—на 11,6 проц.

Калі калгасамі плян кантрактацыі ільну па БССР выкананы на 22,5 проц. і па канопляхі на 17,8 проц., дык індывідуальным сэктарам па ільне—толькі на 2%, а па канопляхі—на 0,5%. Такое на тастрафічнае становішча кантрактацыі ў індывідуальным сэктары ўжо ў цяперашні час сыгналізуе аб стварэньні пагрозы выкананьню пляну пасеву тэхнічных культур наогул.

Асноўная прычына незыкананьня пляну кантрактацыі хаваецца ў праваапартуністычнай практыцы, падсі на самацёк і недаацэнцы важнасьці значэньня тэхнічных культур. Дырэктывы ЦК і СНК аб тым, што пастанова большасьці кантрактантаў населенага пункту зьяўляецца абавязковай для меншасьці, у большасьці раёнаў ня выконваюцца. Зусім незадавальняюча праводзіцца дача цьвёрдых заданьняў кулацкім гаспадаркам аб пасеве ільну і канапель і амаль поўная адсутнасьць уліку гэтых заданьняў. Толькі рашуча націскаючы на кулака, праводзячы ўсе нашы мерапрыемствы праз групы бедноты, даючы рашучы адпор правым апартуністам,—мы зможам выканаць плян пасеву і кантрактацыі тэхкультур.

Рэзультаты праведзенай работы па кантрактацыі тэхнічных культур ніякім чынам не забясьпечваюць выкананьня пляну. У індывідуальным сэктары работа амаль не пачата.

Асноўнай задачай раённых і цэнтральных арганізацый зьяўляецца зараз праверка выкананьня дырэктыў кіруючых арганізацый аб правядзеньні кантрактацыі.

Лацік.

Аграапартуністы

ПАД ПРЫКРЫЦЬЦЁМ НАВУКОВАЙ АРГУМЭНТАЦЫІ

У некаторых саўгасах і калгасах, з боку аграпэрсаналу, мелі месца супярэчнасьці і нават процідзеяньні супроць плянавага павялічэньня плошчы пад засеў культуры ільну.

З асаблівай настойлівасьцю і адкрытасьцю адмахваліся ад пляну павялічэньня пасеўнай плошчы ільну ў саўгасе Адаменка, Лёзьненскага раёну, на Віцебшчыне.

Там у якасьці «неадхільных довадаў» высоўвалі навуковы аргумэнт: «ва ўпадрадкаванай сыстэме поля, само чаргаваньне культур, складзенае на прынцыпе рацыянальнага вынаростаньня спажыўных матэрый у глебе, акрэсьлівае ўжо колькасьць засеву той ці іншай культуры; і што ўсякае парушэньне севазвароту ў бок пашырэньня ці начапчэньня плодазьменны, пагражае зьбяднеьнем глебы і высіленьнем глебы ад часта паўторных культур. У даным выпадку парушэньне севазвароту, (які ўжо заключае лён) за лік павялічэньня пасеву ільну-ж, іменна пагражае глебе ільнавысіленьнем, бо старая с.-г. навука пацьвярджае, што сеяць лён на адным і тым-жа месцы можна толькі пасьля 7-9 год».

Далей. Пасеўны плян, з павялічанай плошчай засеву ільну, ва многіх гаспадарках з усіх поўленым севазваротам сапраўды выклікае клапатлівую ломку палёў і ператкасоўку севазвароту, а гэта прымушае аграпэрсанал раскінуць мазгамі і напружана шукаць умелага выхаду са становішча. А калі прыняць пад увагу, што ў наладжанай гаспадарцы быў ужо дасягнуты ўзгоды забясьпечаючы супакой, кантакт, як у добрай машыне, дык зусім недапушчальна меркаваць, што апартуністычныя тэндэнцыі, пад прыкрыцьцём навуковай аргумэнтацыі адмахнуцца ад клапатлівага пасеўпляну, існуюць ня толькі ў Адаменках.

Яравы выпікі такіх адносін аграабломаньня да заданьняў партыі і ўраду прадставіць ня цяжка.

Вось дырэктар саўгасу ці калгасу... Ён—«25-цітысячнік» ад варштату. Ён быць можа вельмі добры токар ці лідэйшчык і добры партыец. Ён патрабуе катэгарычнага выкананьня пляну, а агра-вучоны апартуніст, які сумуе аб спакойным самацёку, б'е «25-цітысячніка» ад варштату проста ў доб.

— Дарагі таварыш, пасеўны плян, мы, зразумела выканаем на ўсе сто... але... над вашу адказнасьць... Я папярэджаю і нават пісьмова, што парушэньне падзявога парадку, што палярная анархія вядзе да ільнавысіленьня глебы. Сёньня мы засеем, але дзе мы будзем сеяць у наступным годзе? У будучым годзе пад лён ня будзе месца.

Галавацяпам нікому ня хочацца быць. Ня хоча быць галавацяпам і рабочы — дырэктар.

— Чорт яго ведае... Ільнавысіленьне... вучоная штука... Аб'ектыўныя прычыны ў надлішасьці: супроць ражна не папрэш...

Што можа аграному ў полі сказаць, скажам, токар? Вось калі-б на заводзе, ля варштату?..

Сельска - гаспадарчую тэхніку адразу ня возьмеш.

І сумняваецца дырэктар...

У даным артыкуле, мы пастараемся асьвятліць пытаньне аб ільнавысіленьні глебы. Па-першае: палажэньне аб ільнавысіленьні глебы, на падставе якога чаргаваньне ільну ў севазвароце акрэсьлена тэрмінам у 7-9 год, апошнімі даньмі навуковых дасьледваньняў рашуча абвяргаецца. Навейшыя даньні навукі аб паніжэньні ўраджаю, якасьці і вырадженьні ільну, які сеецца некалькі год усьцяж на адным і тым-жа месцы, тлумачыцца не высіленьнем глебы, а зьяўленьнем у ёй асобнага паразытуючага грыбка, які жыве за кошт ільну. Асаблівасьці ільнянай культуры проста даюць гэтаму грыбку ўмовы супольнага жыцьця. Значыцца, трэба толькі знайсьці спосаб зьнішчэньня гэтых умоў сімбіёза і тое, што называлася ільнавысіленьнем—зьнікне.

На дасьледчых станцыях нашай с.-г. акадэміі ўжо культывуецца насеньне ільну, якое не дапускае супольнага жыцьця з грыбком.

Па-другое — штодзённы вопыт ільнаспэцаў гаворыць: што пры ўмове поўнага ўгнаеньня гноем за год да засеву і поўнага мінэральнага перад засевам, лён будзе добра радзіцца два і нават тры гады ўсьцяж на адным і тым-жа месцы. І ў севазвароце можа паўтарацца праз 2-3 гады.

Адно, чаго ня любіць лён—гэта цяжкіх гліністы́х, лёгкіх пескаватых і ваннаных глеб.

Пасеўны плян тэхнічных культур, у тым ліку і ільну, павінен быць выкананы на што-б там ні стала. І аграапартуністы дарэмна будуць паўтараць Зубрылінскія «азы» аб ільнавысіленьні глебы. Псэўда - навуковая сутнасьць гэтых аргумэнтаў ясная: гэта—зрыў пляну.

Мы заклікаем кіруючых саўгасных і калгасных гаспадаркамі таварышоў, якія ня маюць яшчэ выстарчальнага с.-г. вопыту, да асаблівай пільнасьці на гэтым фронце, бо клясавы вораг усюды шукае хоць маленькую шчыліну, каб нам пашкодзіць.

Мы таксама выказваем пажаданьне, каб с.-г. акадэмія выдала папулярную брашуру аб культуры ільну, дзе ў якасьці цьвёрдага і аўтарытэтнага інструктаваньня, быў-бы паложан самы апошні навукова - дасьледны матар'ял.

А. ОРШЫН.

40 ільнаапрацоўчых заводаў—ільнаводным раёнам

Сваячасова пачаць будаўніцтва

Пасеўная плошча тэхнічных культур у БССР параўнальна з мінулым годам павялічваецца, паводле пляну, амаль на 80 проц. Асабліва пашыраюцца ў гэтым годзе пасевы ільну.

Яшчэ ў мінулым годзе пераапрацоўка такой вялікай колькасьцільнай рупной рабочай сілай выклікала значныя труднасьці ў сацыялістычным сэктары. Таму ўрад БССР пастанавіў пабудаваць у гэтым будаўнічым сэзоне на тэрыторыі БССР звыш 40 ільнаапрацоўчых заводаў. Гэта значна аблегчыць пераапрацоўку ільну і канапель.

Паводле пастановы ўраду гэтыя заводы павінны быць пабудаваны не пазьней 1 кастрычніка 1931 году з такім разьлікам, каб яны ўжо пераапрацоўвалі ўраджай ільну і канапель гэтага году.

Наркамзем БССР яшчэ ў пачатку лютага даў дырэктывы адпаведным райвыканкамам аб выбары вучасткаў для пабудовы заводаў. На жаль, рад раёнаў адмовіліся бюракратычна да гэтай справы, і сапраўдная дарога ня была скарыстана для падвозу будаўнічых лесаматар'ялаў. Для будаўніцтва гэтых заводаў патрэбны рабочы-будаўнікі, спэцыялісты-тэхнікі, дасьпітнікі, а таксама і будаўнічыя матар'ялы. На сёньняшні дзень усе гэтыя пытаньні яшчэ ня вырашаны.

Наркамправы БССР павінен зараз-жа забясьпечыць будаўніцтва кваліфікаванай рабочай сілай.

Дзяржбанк і іншыя арганізацыі павінны забясьпечыць будаўніцтва патрэбнымі матар'ялямі.

Толькі пры пільным нагляде за ходам будаўніцтва будзе выканана дырэктыва ўраду.

...мына.

ВАЖНЕЙШАЕ ВЫНАХОДНІЦТВА МАРЫНУЕЦЦА У КАНЦЫЛЯРЫЯХ

ЦИК РСІ павінна дапамагчы вырашыць праблему пераапрацоўкі Ільну

У адным з буйнейшых ільнасаўгасаў у Борках у 1930 годзе было засеяна 430 гэкт. ільну, апрацоўка якога на пад сілу пры вялікім недахваце рабочых рук. Прымітыўным спосабам апрацоўваць лён у такой колькасьці на было магчымасьці. Машын ня было.

Адміністрацыя саўгасу і рабочы актыў ламалі галаву над вынаходкаю такім машыны для апрацоўкі ільну.

Намесьнік дырэктара ільнасаўгасу тав. Штэйнберг (член партыі, выпускнік) вынайшоў складаную машыну на зчосе галоваи ад ільну і ўжо на першых парах машына дае даволі вялікую прадукцыйнасьць — да 8 тон пры 8-гадзінным рабочым дні, што далёка перавышае існуючую машыну, вынайдзеную Гольштэйнам, прадукцыйнасьць якой — 3 тон ільну у суткі.

Але тав. Штэйнберг не спэцыяліст, без тэхнічных ведаў, сканструяваў сваю машыну без дасканалых тэхнічных разьлікаў. Пры тэхнічным удасканаленьні гэта машына магла-б даць прадукцыйнасьць у 10 раз большую.

Тав. Штэйнберг зьвярнуўся ў Ільнакананаплаводтрэст у Маскве і да кіраўнікоў-партыйцаў: тыя адносьліся да вынаходніцтва спрыяюча і прапанавалі спэцыялістам інстытуту ільну і канапель прыняць меры да распаўсюджэньня машыны па СССР. Адзін з кіраўнікоў інстытуту, інжынэр Сіваічэнка М. С. ухваліў канструкцыю машыны, пажадаў вынаходніку далейшых посьпехаў у гэтай галіне і прапанаваў тав. Штэйнбергу больш удасканаліць сваю машыну і тогды тады зьвярнуцца ў інстытут. М. С. Сіваічэнка прапанаваў т. Штэйнбергу самому перакананструяваць сыстэму падачы ільна-салёмы ў машыну, што зьяўляецца вельмі тэхнічна-складанай часткай машыны.

Вынаходзіць гэту работу т. Штэйнберг зараз пры надзвычайнай перагрузцы асноўнай работай ня зможа. Неабходна тэрміновa адарваць з ільнакананаплаводтрасту ці інстытуту ільну і канапель спэцыяліста, які-б пад кіраўніцтвам тав. Штэйнберга выканаў тэхнічныя чарцяжы і ўдасканаленьне машыны.

Пастановы 6-га зьезду саветаў у масы

Зьдзельшчына—магутны вагар уздыму прадукцыйнасьці працы ў калгасах і новага калгаснага прыліву

Аб папулярызацыі пастаноў VI зьезду саветаў і III зьезду калгасьнікаў

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б) ад 26-III-1931 г.

1. У сувязі з дырэктывай ЦК УсеКП(б) ад 26-III 1931 г. тэлеграфна прапанаваць РК КП(б)Б склікаць на 2-3 красавіка ва ўсіх раёнах нарады старшынь калгасаў для растлумачэньня і папулярызацыі пастаноў VI Усесаюзнага зьезду саветаў і III зьезду калгасаў БССР аб калектывізацыі і парадку разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю ў калгасах.

2. Абавязаць РК КП(б)Б і Калгасцэнтр правесьці пасьля раённых нарад старшынь калгасаў сходы па ўсіх калгасах з прыцягненьнем аднасобнікаў—бедняко́ў і сераднякоў для шырокага растлумачэньня пытаньняў арганізацыі працы і разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю, для штодзённай праверкі падрыхтаванасьці да сяўбы і правесьці на пазьней 5-6 красавіка месавы пробны выхад у поле.

3. Усю масавую работу ўлічваць з задачай узмацненьня тэмпаў калектывізацыі, камандзіраваўшы раённы актыў у калгасы і вёскі для правядзеньня работы па арганізацыі новых калгасаў на аснове шырокага растлумачэньня пастаноў VI зьезду.

4. Прапанаваць Калгасцэнтру абслугоўваць раённыя нарады представаўнікамі Калгасцэнтру, для чаго скарыстаць таварышоў, якія мабілізаваны на правядзеньне пасеўнай кампаніі.

Сакратар ЦК КП(б)Б
ШАРАНГОВІЧ.

Пастанова праўленьня Калгасцэнтру БССР

Выходзячы з таго, што пасьпяховае правядзеньне пасеўнай і ўборачнай кампаній бягучага году залежыць ад таго, наколькі рашуча будзе ўстаноўлен парадак разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю па колькасьці і якасьці працы, а не па едаках, праўленьне Калгасцэнтру БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць праўленьні калгасаюзаў і калгасаў прапрацаваць на ўсіх калгасах пастановы VI Усесаюзнага зьезду саветаў і III зьезду калгасаў БССР аб калгасным будаўніцтве і фактычна перайсьці па асноўных сельска-гаспадарчых работах на зьдзельшчыну, ацэненую ў працадніх да 15-га красавіка.

2. У мэтах практычнага ажыцьцяўленьня гэтай задачы прапанаваць райкалгасаюзам правесьці да 3-га красавіка нарады старшынь калгасаў для распрацоўкі пастаноў VI зьезду саветаў і III зьезду калгасаў па калгасным будаўніцтве,—галоўным чынам канкрэтна распрацаваць асноўныя палажэньні арганізацыі працы (пераход на нормы выпрацоўкі, зьдзельшчыну, улік у працадніх), а таксама распрацаваць асноўныя прынцыпы разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю.

3. Пасьля правядзеньня раённых нарад і інструктаваньня старшынь калгасаў безадкладна мабілізаваць увесь раённы актыў (паставіўшы спэцыяльна гэта пытаньне ў раённых кіруючых арганізацыях) і пакіраваць у калгасы для правядзеньня растлумачэньня калгасьнікам гэтых пытаньняў і практычнага пераходу на цьвёрдыя нормы выпрацоўкі—зьдзельшчыну, улік у працадніх і г. д.

Пасылаць у калгасы работнікаў трэба толькі тых, якія добра разьбіраюцца ў пытаньнях арганізацыі працы і разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю і могуць забясьпечыць правільнае інструктаваньне па гэтых пытаньнях.

4. Прапанаваць райкалгасаюзам арганізаваць штодзённае асьвятленьне па старонках газэт практычнага вопыту лепшых калгасаў, якія ўжываюць зьдзельшчыну.

5. Для аказаньня дапамогі раёнам у выкананьні гэтай пастановы камандзіраваць на месцы інструктароў і членаў праўленьня Калгасцэнтру.

Усе мабілізаваныя таварышы павінны выехаць у раёны не пазьней 28-га сакавіка.

Абавязаць райкалгасаюзы даць падрабязную справаздачу аб выкананьні гэтай пастановы да 12-га красавіка 1931 году.

Старшыня праўленьня Белкалгасцэнтру Міцькоў.

Аб устанаўленьні тэрміну пасеву яравых культур увесну 1931 г.

З пастановы калегіі Народнага Камісарыяту Зямляробства БССР ад 25 сакавіка 1931 г.

1) Другая бальшавіцкая веснавая пасеўная кампанія 1931 г., вясна трацяга рашаючага году 5-годкі патрабуе максымальнай мабілізацыі сіл, сродкаў і энтузіязму рабочых саўгасаў, калгасьнікаў і бядняцка-сераднядкіх мас сялянства на выкананьне заданьняў ураду па засеве яравых культур увесну 1931 г.

2) Сваячасовае скананьне сяўбы і правядзеньне яе ў самы кароткі тэрмін дасьць магчымасьць саўгасам, калгасам і бядняцка-сераднядкім гаспадаркам раней распачаць уборку ўраджаю, асабліва прадаёмкіх культур ільну і бульбы і гэта ў сваю чаргу дасьць магчымасьць для саўгасаў і калгасаў хутчэй вырашыць недахват працоўнай сілы ў час асенняй уборачнай кампаніі.

3) Бальшавіцкае правядзеньне і сваячасовае скананьне веснавой сяўбы, павінна зьявіцца магутным стымулам новага прыліву ў калгасы, арганізацыі новых калгасаў і на іх аснове ліквідацыі кулацтва як кляснага.

Выходзячы з необходнасьці больш пасьпяховага правядзеньня сяўбы яравых культур увесну 1931 г., калегія Народнага Камісарыяту Зямляробства пастанаўляе:

1) Зацьвердзіць граничныя тэрміны скананьня сяўбы яравых культур увесну 1931 г.

а) Для раёнаў: Тураўскага, Лельчыцкага, Каралінскага, Нараўлянскага, Юравіцкага, Камарынскага, Брагінскага, Лоеўскага, Хойніцкага, Церахаўскага, Гомельскага, Рэчыцкага, Веткаўскага, Уваравіцкага, Буда - Кашалёўскага, Чачэрскага, Мазырскага, Азарыцкага, Калатковіцкага, Жыткавіцкага, Пятрыкоўскага, Чырвонапольскага, Кармянскага, Журавіцкага, Жлобінскага, Парыцкага, Рагачоўскага, Глускага, Любаньскага, Старобінскага, Чырвона-Слабодскага, Слуцкага, Стара-Дарожскага і Бабруйскага—да 20 мая 1931 году;

б) для раёнаў: Хоцімскага, Касьцюковіцкага, Клімавіцкага, Крычаўскага, Чэрыкаўскага, Чавускага, Прапойскага, Мсьціслаўскага, Быхаўскага, Чаўсіцкага, Клічаўскага, Сьвіслацкага, Асіпавіцкага, Гроскага, Копыскага, Вуньдзінскага, Пухавіцкага, Чэрвеньскага, Вяровейскага, Вялыніцкага, Дрыбінскага, Расонскага, Мсьціслаўскага, Піклоўскага, Сьмілавіцкага, Менскага, Койданаўскага, Заслаўскага, Смалявіцкага, Лепельскага, Барысаўскага, Плешчаніцкага, Вяломіцкага, Халопеніцкага, Крупскага, Круглянскага, Клімыльскага, Горацкага, Кохановскага, Чарэйскага і Талачынскага—да 25 мая 1931 году;

в) для раёнаў: Ляднянскага, Дубровенскага, Аршанскага, Багушэўскага, Сеньненскага, Чашніцкага, Лёзьненскага, Высачанскага, Бешанковіцкага, Віцебскага, Суражскага, Гарадоцкага, Сірацінскага, Межынскага, Лепельскага, Вушацкага, Полацкага, Ветрынскага, Браслаўскага, Расонскага, Асьвейскага і Дрысенскага—да 30 мая 1931 г.

3) Абавязаць цэнтральны с.-г. і калгасе існуючыя ў іх распрадзельні трактарныя паркі прыцясьці ў поўную баявую гатоўнасьць для перакідак іх на ўзмацнёнае правядзеньне сяўбы як з боку раёнаў посьпяхі сяўбы, так і наадварот.

4) Абавязаць цэнтральныя с.-г. і калгасна-каапэрацыйныя сыстэмы і раёны пасьлі шырокую падрыхтоўчую і растлумачальную работу серод рабочых саўгасаў, калгасьнікаў і бядняцка-сераднядкіх мас сялянства на поўнае вык

Спажывецкая каапэрацыя БССР выканала 50% фінпляну

НА ГРАМАДЗКІ БУКСІР!

БЕЛКААПСАЮЗ І МЯСЦКОМ № 2 ЧЫГУНКІ ПРЫНЯЛІ ВЫКЛІК „ЗЬВЯЗДЫ“ І ЗАВОДУ АМО НА ШТУРМ ПРАРЫВАУ У МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАУ

Абвешчана мабілізацыя ўсіх работнікаў каапэрацыйнай сыстэмы

Красавік—ударны месяц барацьбы за фінплян

Прымаем выклік „Зьвязды“

У СУВЯЗІ З ДРЭННАЙ РАБОТАЙ ПА МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ НАСКЛЬНІЦТВА Ў ПЕРШЫМ КВАРТАЛЕ, У АДКАЗ НА ВЫКЛІК РАБОЧЫХ ЗАВОДУ АМО І ГАЗЭТЫ «ЗЬВЯЗДА», ПРАЎЛЕНЬНЕ БЕЛКААПСАЮЗУ РАЗАСЛАЛА НАСТУПНУЮ ТЭЛЕГРАМУ ЎСІМ ЦЭРАБКОПАМ, ТРАНСПАРТНЫМ І РАЁННЫМ СПАЖЫВЕЦКІМТ-ВАМ:

«ПРАЎЛЕНЬНЕ БЕЛКААПСАЮЗУ АБВЯШЧАЕ МАБІЛІЗАВАНЫМ НА ЛІКВІДАЦЫЮ ПРАРЫВУ Ў МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ УВЕСЬ АПАРАТ СЫСТЭМЫ СПАЖЫВЕЦКАЙ КААПЭРАЦЫІ. ПРАПАНУЕЦЦА РАЗГАРНУЦЬ ВАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ РАБОТЫ ПА ЛІКВІДАЦЫІ ПРАРЫВАЎ. НА ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ГЭТАЙ БАЯВОЙ РАБОТЫ ПАВІНЕН БЫЦЬ ШЫРОКА СКАРЫСТАНЫ КААПЭРАЦЫЙНЫ АКТЫЎ.

28 спажывецкіх таварыстваў праяўляюць злачынную бязьдзейнасьць

У выніку апартуністычных адносін раду арганізацый спажывецкай каапэрацыі да выкананьня заданьняў па мабілізацыі сродкаў і недаацэнкі палітычна-гаспадарчага значэньня свячасовага і поўнага збору паёў, укладаў і авансаў,—зрываецца плян мабілізацыі сродкаў за першы квартал бягучага году. Квартальнае заданьне выканана спажывецкай каапэрацыяй толькі ў разьмеры 50,8 проц. (горад 95,8, вёска 40,8 проц); па ўкладах замест прыросту ў 210 тыс. ёсьць зьмяншэньне ў 60 тыс. руб. Плян збору мэтавых узносаў на будаўніцтва выкананы толькі на 74,8 проц.

28 РАЁННЫХ СПАЖЫВЕЦКІХ Т-ВАЎ праявілі злачынную бязьдзейнасьць і выканалі плян збору паёў менш чым на 20 проц. Гэта—Азэрыцкае, Бабруйскае, Барысаўскае, Бешанковіцкае, Брагінскае, Бягомльскае, Бялыніцкае, Высачанскае, Жлобінскае, Журавіцкае, Кармянскае, Клімавіцкае і інш. т-вы. З цэрабкопаў плятуцца ў хвасьце: ПОЛАЦКІ і РЭЧЫЦКІ.

Ня гледзячы на важнасьць тэрміновага атрыманьня мэтавых узносаў на капітальнае будаўніцтва і прыгарадныя гаспадаркі збор узносаў недапушчальна слабы. За 20 дзён сакавіка месячнае заданьне выканана толькі ў разьмеры 33,3 проц.

Добра выканалі заданьне МАЗЫРСКІ ЦРК—больш 260 проц., АРШАНСКІ — пы работы.

172 проц., ВІЦЕБСКІ—130 проц. Дрэнна праводзяць збор узносаў РЭЧЫЦКІ ЦРК —36,5 проц., ПОЛАЦКІ—46 проц. МЕНСКІ ЦРК НІЧОГА ДАГЭТУЛЬ НЕ ЗРАБІЎ.

З раённых спажывецкіх т-ваў зусім адстаюць па мэтавых узносах БРАГІНСКАЕ—10 проц., КОХАНАЎСКАЕ—6,2 проц., ВУЛЬСКАЕ—6,3 проц.

Спажывецкая каапэрацыя дрэнна выконвае дырэктывы аб мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў і аб паскарэньні таваразвароту. Заданьне па рэалізацыі тавараў выканана за 20 дзён сакавіка на 41,8 проц., пры павышанай наяўнасьці таварных рэшткаў, у параўнаньні з кантрольнымі лічбамі.

Адзначаючы ўсе гэтыя прарывы ў рабоце спажывецкай каапэрацыі, праўленьне Белкаапсаюзу ў спэцыяльнай пастанове пастанавіла абвясьціць да 1 мая месячнік мабілізацыі сродкаў па спажывецкай сыстэме.

Праўленьне, ад імя спажывецкай каапэрацыі, прыняло выклік рабочых заводу АМО і газэты «Зьвязда» і абвясьціла ўвесь апарат спажывецкай сыстэмы БССР мабілізаваным на ліквідацыю прарываў у фінпляне.

Спажывецкая сыстэма павінна паказаць сваю здольнасьць выконваць баявыя заданьні партыі і ўраду, уцягнуць вы заданьні партыі і ўраду, уцягнуць вы работу шырокія каапэраваныя масы, на-хаду перабудаваць на баявыя тэмпы каапэрацыйны лічбамі.

Мабілізаваць унутраныя рэсурсы прамысловасьці

27 сакавіка ў Наркамфіне БССР, пад старшынствам тав. Хацкевіча, адбылася нарада прадстаўнікоў НКФ і гаспадарчых арганізацый на пытаньні аб мабілізацыі сродкаў.

На нарадзе былі абгавораны даклады ВСНГБ і Белшвэйаб'яднаньня. Дакладчык з ВСНГБ не падрыхтаваўся і ня мог даць поўнага малюнку становішча мабілізацыі сродкаў па прамысловасьці. Яго дапоўнілі таварышы, якія выступалі ў спрэчках.

Выявілася, што мабілізацыя сродкаў унутры прамысловасьці ідзе нездавальняюча. Дырэктывы аб зьніжэньні сабекошту ня выканаены, плян накапленьняў недавыкананы на 4 млн. руб.

Дакладчык з Белшвэйаб'яднаньня адзначыў наяўнасьць залежаў тавараў на прадпрыемствах аб'яднаньня больш, чым на 1 млн. рублёў.

Дырэктыва аб зьніжэньні сабекошту выканана ніпоўнасьцю, замест 5,1 проц. (за студзень-люты) зьніжэньне дасягнае 4,7 проц.

Дакладчык імкнуўся апраўдаць гэтыя прарывы «аб'ектыўнымі прычынамі» — адсутнасьцю тары, непадачай вагонаў.

Падагуліўшы спрэчкі, наркамфін тав. Хацкевіч адзначыў, што прамысловасьць ня ўжыла ўсіх мер да мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, што гаспадарчы разрахунак праводзіцца слаба, ня ўжыта рашучых мер для барацьбы з залежамі тавараў; пройдзецца ўжыць меры фінансавай узьдзейнасьці ў адносінах тых гаспадарчых арганізацый, якія дрэнна мабілізуюць сродкі.

Нарада пастанавіла прасіць ЭКАНА пастаніць даклад ВСНГБ аб мабілізацыі сродкаў на адным з бліжэйшых пасяджэньняў.

ЧЫГУНКА УКЛЮЧАЕЦЦА У ПАХОД ЗА СРОДНІ

Пастаўленыя перад спажывецкай сыстэмай задачы па мабілізацыі сродкаў патрабуюць згуртаваньня шырокіх мас рабочых, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў вакол баявога заданьня, у мэтах узмацненьня збору паёнакапленьняў, авансаў, укладаў і г. д.

Вялікае значэньне набывае выклік заводу АМО, да якога далучылася газэта «Зьвязда», аб правядзеньні дзесяцідзённіка ліквідацыі прарываў у фінпляне спажывецкай каапэрацыі, выклік на мабілізацыю каапэраваных мас вакол баявой задачы.

Мясцком № 2 станцыі Менск МБД пастанавіў прыняць выклік заводу «АМО» і «Зьвязды» і выпучыў брыгаду ў ліку 3-х чалавек для праверкі ходу мабілізацыі сродкаў па спажывецкай сыстэме. Мясцком выклікаў іншыя мясцкомы вузла на сацыялістычнае спаборніцтва ў данай галіне.

Прадпрыемствы г. Менску павінны ўключыцца ў кампанію і прыняць усе меры для збору паёў, укладаў і авансаў.

ПАД СУД—ЗА ЗРЫЎ МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ

Пастанова праўленьня Белкапгасцэнтру

Праўленьне Белкалгасцэнтру ў сваёй пастанове аб мабілізацыі сродкаў па калгассыстэме адзначыла, што большасьць райкалгассаюзаў не праводзіла амаль ніякай работы па мабілізацыі сродкаў, і таму заданьне знаходзіцца пад пэўнай пагрозай.

За нядбайныя адносіны да мабілізацыі сродкаў і за зрыў заданьняў праўленьне прыцягвае да судовай адказнасьці старшынь Чэрыкаўскага, Чавускага, Жлобінскага, Журавіцкага і Мсьціслаўскага райкалгассаюзаў. Абвешчана суровая вымова з папярэджаньнем старшыням Бешанковіцкага, Бягомльскага, Нараўлянскага, Буда-Кашалёўскага, Журавіцкага, Жыткавіцкага, Лёзьненскага, Лоеўскага, Лельчыцкага, Мсьціслаўскага, Сураскага, Халопеніцкага, Чэрвеньскага, Клімавіцкага і Асьвейскага райкалгассаюзаў.

Усім райкалгассаюзам катэгарычна прапанавана дабіцца пералому ў выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў. Тым раёнам, якія ня выказаюць заданьня па мабілізацыі сродкаў у першым квартале, будуць закрыты крэдыты і сышчына будаўніцтва машына-трактарных станцый.

Машына-трактарныя станцыі будуць будавацца ў тых раёнах, якія выканалі плян рэалізацыі акцый Трактарацэнтру.

Як нельга адносіцца да баявой кампаніі

Апартуністычная нягібкасьць тармозіць работу

Менскі чыгуначны вузел зьяўляецца шэфам Белкаапсаюзу. Здаецца, што ён першым павінен быў адгукнуцца на выклік заводу АМО і «Зьвязды».

Аднак, факты сьведчаць, што кіраўнікі вузла апартуністычна недаацэньваюць значэньня гэтай справы. Сакратар парткому станцыі Менск на запытаньне работніка «Зьвязды», што зроблена ў адносінах дапамогі Белкаапсаюзу па мабілізацыі сродкаў, адказаў, што чыгуначнікі даўно ўжо заняліся гэтай работай, што вылучана брыгада, якая працуе ў Белкаапсаюзе і няма чаго далучацца да выліку. Калі работнік «Зьвязды» абышоў усе сэктары Белкаапсаюзу, то вызьвялася, што ніякай брыгады ў апараце няма і ніхто аб ёй ня ведае. Гэтакае «очковтирательство» зусім недапушчальна.

Яшчэ адзін факт апартуністычнай нярухомасьці недаацэнкі мабілізацыі сродкаў. Праўленьне Белкаапсаюзу яшчэ 25 сакавіка прыняло выклік заводу АМО і «Зьвязды» і на пасяджэньні прыняло рад канкрэтных мерапрыемстваў па ліквідацыі прарыву. Аднак, сакратар Белкаапсаюзу тав. Кома да 29 сакавіка не паслаў гэтай пастановы на месцы, — казалі яна дойдзе да месц яшчэ невядома.

Па апартуністычнай недаацэнцы мабілізацыі сродкаў трэба ўдарыць, як належыць.

Камсад ф-кі „Кастрычнік“—непрацаздольны

Нядаўно на пасяджэньні Менскай гарадзкой камісіі садзейнасьці дзяржкрэдыту і ашчадсправе былі заслуханы справаздачы: Менскага аддзяленьня Дзяржбанку, гарашчадкасы і камісіі садзейнасьці швэйнай фабрыкі «Кастрычнік».

З дакладу камсаду швэйнай фабрыкі «Кастрычнік» высьветлілася, што падпіскай на пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады» з 1.834 рабочых ахоплена 1.784. Фабрычная ашчадкаса на 1-е сакавіка аб'ядная 940 укладчыкаў; сума ўкладаў складае 30 тысяч рублёў (кантрольнае заданьне — 23 тысячы руб.). Такім чынам заданьне па ўцягненьні ўкладаў у ашчадкасы перавыкананае. Заданьне па рэалізацыі машыны таксама выканана цалкам.

Ня гледзячы на некаторыя дадатнія паказальнікі, работа камсаду фабрыкі «Кастрычнік» прызнана нездавальняючай. Камсад большай часткай займаўся разглядам заяў аб продажы і закладзе аблігацый і зусім выпусьціў з-пад увагі пытаньне ўзмацненьня мабілізацыі сродкаў. Работа камсаду за апошні час зусім заняпала. Грамадзкасьць не мабілізавана вакол мабілізацыі сродкаў. Цэхавыя насьценгазэты і німаттыражкі фабрыкі не зварачалі належнай увагі на гэту кампанію.

Рэарганізацыя органаў сацстраху

У БССР арганізуюцца 50 самастойных страхавых пунктаў

Галоўсацстрах БССР распрацаваў праект рэарганізацыі сацстраху.

Паводле праекту, на ўсіх буйных прадпрыемствах БССР, ДЗЕ ПРАЦУЕ НЯ МЕНШ 800 РАБОЧЫХ і ў буйных саўгасах, леспрамгасах і на торфазаводах з колькасьцю НЯ МЕНШ 400 пастаянных рабочых будуць арганізаваны САМАСТОЙНЫЯ ВЫПЛАТНЫЯ СТРАХАВЫЯ ПУНКТЫ. Такіх пунктаў у БССР будзе каля 50.

Усёй працай пунктаў будуць кіраваць члены ФЗМК прадпрыемстваў. На буйных прадпрыемствах, з колькасьцю звыш 2 тыс. застрахаваных рабочых, загалачкі выплатных пунктаў вызваляюцца ад работы на прадпрыемстве і ўтрымліваюцца за кошт страхкас.

На цэхавых і агульных сходах рабочых выбіраюцца страхавыя дэлегаты, якія і будуць складаць актыў страхавога пункту. Для лепшай арганізацыі працы ў дапамогу выплатному пункту, фабзаўкомамі арганізуюцца бюро з 3 членаў са складу страхавых дэлегатаў.

Выплатны пункт складае свой бюджэт і робіць справаздачы аб выдаткаваньні сродкаў перад ФЗМК і раённай або гарадзкой страхкасай. 50 проц. эканоміі ад рацыянальнага выкарыстаньня сродкаў пойдуць на паляпшэньне сацыяльна-бытавых умоў рабочых данага прадпрыемства.

У функцыі страхавога пункту ўваходзіць нагляд за пастаноўкай мэдычна-прафілактычнага абслугоўваньня рабочых прадпрыемства; кантроль над выдаткаваньнем сродкаў, адпушчаных на мэддапамогу; арганізацыя дыэтычнага харчаваньня на прадпрыемстве; разьмеркаваньне месц на курорты, санаторыі і ў дамы адпачынку; кантроль за правільным прадастаўленьнем адпачынку па часовай непрацаздольнасьці; назначэньне забесьпячэньня па інваліднасьці; удзел у арганізацыі ясьляй, дзіцячых пляцовак, пазьняй, малочных кухань; арганізацыя лекцый, гутарак і дакладаў аб сацыяльным страхаваньні і г. д.

Усе свае фінансавыя апэрацыі страхавыя пункты праводзяць праз канторы прадпрыемстваў.

Для загадчыкаў пунктаў будуць арганізаваны спэцыяльныя кароткатэрміновыя курсы сацстраху.

Цэнтральны апарат Галоўсацстраху БССР будзе рэарганізован у РЭСПУБЛІКАНСКУЮ КАСУ САЦСТРАХУ. Камітэт рэспубліканскай касы будзе выбраны на Ўсебеларускім зьезьдзе прафсаюзаў.

Пленум гарсавету абвяшчае дэкаду ліквідацыі прарываў у рабоце прамысловасьці

У пастанове па дакладу члена прэзыдыуму ВСНГБ т. ДВАРЭЦКАГА аб становішчы прамысловасьці гор. Менску, пленум Менгарсавету, які адбыўся 21 красавіка, прызнаў, што БОЛЬШАСЬЦЬ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ Г. МЕНСКУ НЯ ВЫКАНАЛА ПРАМФІНПЛЯНУ ПЕРШАГА КВАРТАЛУ. Прычыны: АСЛАБЛЕНЬНЕ ЎВАГІ ЗАВОДЗКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ ДА ВЫКАНАНЬНЯ ПРАМФІНПЛЯНУ, АСЛАБЛЕНЬНЕ САЦСПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА Ў выніку нескарыстаньня вытворчай актыўнасьці мас; аб'яднаньні не перабудавалі свайй работы ў мэтах узмацненьня апэрацыйнага і тэхнічнага кіраўніцтва прадпрыемствамі.

Пленум гарсавету пастанавіў абвясьціць ДЗЕСЯЦІДЗЕНЬНІК ЛІКВІДАЦЫІ ПРАРЫВАЎ У ПРАМФІНПЛЯНЕ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ І ПРАПАНАВАЎ ДЭПУТАТАМ ГАРСАВЕТУ ПРЫНЯЦЬ САМЫ АКТЫЎНЫ ЎДЗЕЛ У БАРАЦЬБЕ ЗА МАБІЛІЗАЦЫЮ ЎСІХ СІЛ І СРОДКАЎ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ.

Пленум даручыў ВСНГБ і Белбудаб'яднаньню і Менбуду праверыць, як падрыхтаваны да будаўнічага сэзону ЦАГЕЛЬНІ г. МЕНСКУ.

ВСНГБ даручана дабіцца выкананьня дырэктывы аб 15-процантнай эканоміі апалу.

Зьезд рабочых мукамольна-хлебнай прамысловасьці

27-га сакавіка закрыўся ўсебеларускі зьезд саюзу рабочых мукамольна-хлебнай і кандытэрскай прамысловасьці. У работах зьезду прымалі ўдзел 83 дэлегаты.

З вялікай актыўнасьцю прайшло абгаворэньне дакладаў аб становішчы і перспектывах разьвіцьця хлебапячэньня і мукамольнай прамысловасьці, аб далейшай рабоце крухмальна-патачных і макаронных заводаў.

Удзельнікі зьезду абвясьцілі сябе ўдарнікамі па правядзеньні ўсіх прынятых на зьезьдзе пастаноў і перабудове работы на прадпрыемствах. У склад ЦП новага саюзу выбраны 23 чал. Старшынёй прэзыдыуму выбран тав. Альтман.

МЕНСК

Менскі вузел затрымлівае пасеўныя грузы

Для адпраўкі пасеўных грузаў менскому аддзяленьню Саюзтранса патрэбна штодзенна 18 вагонаў. Гэту патрэбу менскі вузел не задавальняе. 27 сакавіка вузел усяго прадаставіў 5 вагонаў. У выніку таго, што кожны дзень не даваецца пэўны лік вагонаў стварылася вялікая загрузка пасеўных грузаў. Усяго неадпраўленых пасеўных грузаў на сённешні дзень—60 вагонаў.

Барацьба з паводкай

Камісія гарсавету па барацьбе з паводкай прыняла рад канкрэтных мер для папярэджаньня небясьпекі паводкі. Каля мастоў устанаўляюцца лёдарэзы для ломкі ільду. На мастох устанаўляюцца таксама рэйкі для праверкі ўзроўню вады. Праверка будзе рабіцца кожныя суткі. На заводах арганізаваны ўзмоцненыя дзяжурствы рабочых і пажарных дружын. Абсьледаваны заводы «Камунар» і «Бальшавік».

Жаўтам прапанавана ачысьціць студні і рашоткі, якія прымаюць ваду ў Нямігскі калектар.

Прафсаюзныя навіны

— Прэзыдыум ЦП саюзу транспартнікаў 1-га красавіка адкрывае ў Менску вячэрнія курсы для рабочых-выдуманцаў. Курсы будуць рыхтаваць работнікаў па транспартнай справе. Курсантаў вылучаюць рабачкомы.

На 7-гадзінны рабочы дзень

Наркампрацы БССР пастанавіў перавесьці ў бягучым годзе 78,4 проц. прадпрыемстваў мясцовай прамысловасьці БССР на 7-гадзінны рабочы дзень.

У Менску на 7-гадзінны рабочы дзень будуць пераведзены: абутковая майстэрня Менскага гарсавету і фабрыкі: вяровачна-лямцовая, гарбарна-галяніцкая «Усход», панчошна-трыкатажная «Чырвоны тэкстыльшчык»;

У Віцебску: інструментальна-мэблевая, гнутай мэблі, лямцавая і абутковая фабрыкі гаркамбінату і пасазавод № 3;

у Барысаве: рамонтна-гісэрны завод гаркамбінату, пасазавод і калодачная фабрыка;

у Воршы: лясны і мэханічны заводы прамтрэсту; у Магілеве: мэблева-мэтлавая фабрыка прамтрэсту і мукамольна-лесапільны завод «Зорка»;

у Нараўлянах—кандытэрская фабрыка; у Мазыры: фабрыкі па выробе уніцазных дошак і мэблевая; у Бабруйску: мэблевая фабрыка імя Халтурына і камбінаваная майстэрня прамтрэсту; у Полацку—с.-г. рамонтныя майстэрні; у Гомелі—фабрыкі: панчошна-трыкатажная, рымарная і «Казімір» і Гомельсхарыпрам.

З прадпрыемстваў Наркамснабу будуць пераведзены: менскі, віцебскі і магілёўскі мясакамбінаты, полацкая і бабруйская хладабойні, гомельскі мясны Саюзхлеба, менская і віцебская шчотачныя фабрыкі.

З прадпрыемстваў камунальнай гаспадаркі: менскі Эльвод, віцебская і бабруйская электрастанцыі і гомельскі «Водасьвятло».

Паведамленьні

— Сьпіс дакладчыкаў, вылучаных Менгаркомам КП(б)Б для правядзеньня дакладаў на прадпрыемствах з 30-III па 10-IV-31 г. аб «Выніках VI зьезду Саветаў СССР і X зьезду Саветаў БССР». Галадзед—«Бальшавік», Бэнэк—«Полымя рэвал.», Чарвякоў—«Камунар», Гнілякевіч, Калнін—абутковая ф-ка, Гурэвіч—шчотачн. ф-ка, Рапапорт—хлебазавод, Рачыцкі—ф-ка імя з сакавіка, Грысевіч—«Кастрычнік», Платун—Эльвод, Хацкевіч—друк. імя Сталіна, Паллкоў—«Камунарка», Рыжоў—Менбуд, Цымпэйка—ЦП, Валодзька — пічацінная ф-ка, Кавальчук—«ДА», Міцкоў—«Пралетары», Горын—«Беларуска», Валцін—«Беларусь», Рыскін—скарняжная ф-ка, Будзінскі—Белдзяржбуд, Жуковіч — шклозавод, Хаськін—«Чырв. текст.», Дубіна—шпалерная ф-ка, Гей—чыгунка, Шаранговіч — «Энэргія», Карачун — Уціль, Мітлін—п.-к. радакцый, Беразоўскі—рымарная ф-ка, Кірштэйн—Буд. адз. МЦРК, Кучынскі—пажарная к-да, Гурыновіч—Белжыльсаюз, Танхілевіч—Транспартгрэст, Ракаў—каап. пр. харчав., Агульнік—«Чырв. зорка», Якаўлеў—грузчыкі, Фрыдман—хладабойня, Курцік—абутковая майст., Лынко—сьпіртавод, Красіна—хэмфармзавод, Нескрапэвіч—ф-ка імя Крупскай, Верба—УМТ, Галаскок—лямцавая ф-ка, Саевіч—Белсамтрамсаюз, Кінко—каўбасная ф-ка, Башмачнікаў—малочны зав., Казючыц—«Чырв. хэмік». Рэзэрвовыя: Дуцнеп, Ашароўіч, Лойка, Рудзіцкі, Шэйнін, Югаў, Рыўлін, Лацкевіч, Будзін, Агранаўскі.

— Згодна пастановы бюро гаркому КП(б)Б і прэзыдыуму гар. КК КП(б)Б выклікаюцца сёньня, 29 сакавіка, для атрыманьня матар'ялаў на праверцы выкананьня ячэйкамі пастаноў, вынесеных праверкамі ў часе чысткі партыі—наступныя т. т.: Заторскі (6 полк), Калабаў (2 дывізія), Астроўскі (ВДУ), Гарэтляд (ЦП гарнякоў), Любамірскі (Белмэталяаб'яднаньне), Мучнік (друкарня), Раманчук (Гіспарт), Скаўронак (НКАЗ), Розман (ЦП друкароў), Пятрухін (цукерн. ф-ка), Ліўшыц (зав. «Бальшавік»), Пыжыкаў (ЦК КП(б)Б), Анісімаў (ДПУ), Якаўлеў (ЦК КП(б)Б), Готліб (абутковая ф-ка), Каран (ЦК КП(б)Б), Захарава (цэнтр. страхкаса), Длугаженскі (БДВ), Клокаў (Эльвод), Бігэ (ЦКК КП(б)Б), Кросла (МЦРК), Каланіцкі (чыгунка), Грышанаў (7 дывізія), Рымашоў (вайсковы пракур.), Мізяпкоў (7 дывізія), Юдэльсон (НКЮ), Зянчкоўскі (ДЭТ), Блофштэйн, Аверын (ЦКК КП(б)Б), Плятнёў (ЦП саўгаддальслуж.), Вонсак (ЦКК КП(б)Б), Альтшулер (Менбул), Бабуляк (мэдінстытут), Вайнэровіч («Камунарка»), Васільлеў (ВСНГ), Гольдман (друкарня БДВ), Кастрынскі (зав. «ДА»), Кудрукоў (Эльвод), Кавалёў, Плешакоў (ЦПЮБ), Прахін (арт. полк), Рэўтовіч (зав. «Бальшавік»), Фрыдман, Шкірыча (гар. КК), Хонік (Нарсуязь), Цімошчанка (Камвуз), Шчыкало (зав. «Камунар»), Шэйман (ф-ка «Кастрычнік»), Эйнштэйн («Беларуска»), Якімовіч (38 кав. полк), Андрыеўская (зав. «Бальшавік»), Барсукоў (зав. «Полымя рэвалюцыі»), Ганчар (зав. «Энэргія»), Майзіт (ЦВК), Ратнэр (хэмінстытут), Хмалеўскі (шклозавод). Зьявіцца ў гар. КК у 9 гадз. раніцы да 3-х дня і з 5 гадз. веч. да 7 гадз. да т. т. Шкірыча або Лійца. Яўка ўсіх таварышоў абавязкова.

— **Менгарсавет СВБ** склікае на 29 сакавіка, у 8 гадз. веч. у памяшканьні Дому Камасьветы (вакол № 18), пленум гарсавету СВБ. Яўка абавязкова і без спазьненьня.

— **Дом Асьветы.** Сёньня ў 19 гадз.— вечар падпэфнага эскадрону разам з асьветнікамі. Уваход па членскіх білетах.

ДА ЎСІХ ЗАВОЧНІКАЎ І ДАКАМВУЗЬНІКАЎ КУВ'у.

На 30 сакавіка т. г., у памяшканьні Камвузу (Унівэрсытэцкая, 27, 4 ты паверх, жаўтавая заля) у 6 гадзін вечара адбудзецца канфэрэнцыя ўсіх менскіх завочнікаў і дакамлузьнікаў КУВ'у Гомельскай СШП і другіх аддзялак „завочнай партасьветы. Парадак дня: 1) Выкананьне заданьняў завочн. навуч. устаноў. 2) Аб арганізацыі масавага завочнага навучаньня (калсульт. дапамога вярбоўка, забясьпечаньне падручнікамі і інш.). 3) Аб скліканьні выніковых канферэнцый. Яўка абавязкова. Тыя, што ня зьявяцца без дастаткова-ўважлівых прычын, будуць выключаны са складу студэнтаў ЗКС КУВ'у.

Завочна-курсавы сэктар Камвузу Беларусі імя У. І. Леніна.

Адказны рэдактар
С. БУДЗІНСКІ.

Беларускі Другі Дзяржаўны тэатр
Сёньня адкрыты спэктакль
ПЕРШАЯ КОННАЯ
Пачатак у 8 гадз. веч.

Гуказны кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“
Зьвыш праграмы: СУДІДЗЕ справа ЦК РСДРП (меншавікоў). Пачат: 7 г., 8 г. 45 м. і 10 г. 30 м. КАСА—з 5 гадз.

Кіно-тэатр „Культура“
Замежны фільм «ПОРТЫ» Зьвыш праграмы: СУДІДЗЕ справа ЦК РСДРП (меншавікоў). Пачатак: 7 г., 8 г. 45 м. і 10 г. 30 м. КАСА—з 5 гадз.

Кіно „Інтэрнацыянал“
Замежны фільм СКРЫПАЧ з ФЛЁРЭНЦЫІ Пачатак 1-га сэансу ў 6 гадз. Каса з 4 г. 30 м.

КІНО „Пралетары“
Сучасная бытавая драма РАЗВОД у 7 частках Зьвыш праграмы—хроніка Саюзкіно № 9. Пач. 1 сэансу ў 6 г. Каса—з 4 гадз.

КІНО „Юны Піянэр“
Мастацкі фільм ЗАКОН ГОР драма ў 8 частках. Пачатак сэансу ў 1 гадз. дня. Каса—з 12 г. дня.

КІНО „Спартак“
ТАРАС ТРАСІЛА Трагедыя ў 7 частках. Пач. у 7 г. 8 г. 45 м., 10 г. 30 м. Каса—з 5 гадз.

Камісія ЦКК РСІ па праверцы і
ЧЫСТЦЫ Беларускай Акадэміі Навук
30-га сакавіка ў 7 гадзін вечара ў Польпэдтэхнікуме правядзіць
грамадзкі прагляд дзейнасьці Польсэнтару БАН і яго супрацоўнікаў.
Запрашаюць: рабочыя прадпрыемству г. Менску, 6-я школа, 33 школа, польдзядзелы Рабфаку і ПОЛУ, Польсці вандроўны тэатр, працаўнікі газэты „Орка“, НКАсьветы, Польсэнтар БДВ, працаўнікі клюбу Розы Люксэмбург, Польпэдтэхнікум і супрацоўнікі БАН.
Камісія ЦКК РСІ.

Расьнянскі РК КП(б)Б і РКК-РСІ
3-га красавіка, у 10 гадз. раніцы, у памяшканьні РК КП(б)Б
(—) СКЛІКАЕ (—)
раённую нараду рабселькораў,
з наступным парадкам дня: 1) Выніки Усесаюзнай нарады па пытаньнях рабселькораўскага руху. 2) Веснавая пасеўная кампанія і ўдзел рабселькораў у раённай насьценгазэце.
Просьба да ўсіх рабселькораў і членаў рэдкалегій насьценгазэт своечасова зьявіцца на нараду.

Праўленьне МЦРК
даводзіць да ведама насельніцтва гораду Менску, што ў сувязі з усесаюзным перапісам насельніцтва,
на наборных картках будзе наклейвацца марка,
за якую грошы брацца ня будуць.
Праўленьне МЦРК.

Дзярж. выд-ва „Молодая гвардия“ Кнігацэнтр.
Піянэры! Школьнікі! Важатыя! Настаўнікі! Клюбныя работнікі!
Выпісвайце часопісь, якая арганізуе масавую работу піянэраў і школьнікаў
„ЗАТЕЙНИК“
Орган ЦБ ДКА і Наркамасьветы.
РЭДАКЦЫЙН. КАЛЕГІЯ: А. Бойм, С. Садомская, Л. Бочкін, Н. Студзянецкі, Н. Сац, (——) В. Кадачынскі, А. Окунчыкаў. (——)
„ЗАТЕЙНИК“ дзецям лепшы прыяцель,
ён арганізуе іх адпачынак.
У часопісі вы заўсёды знойдзеце п'есу для правядзеньня баявой кампаніі, матар'ял для п ведзеньня вечароў сьвят у горадзе і вёсцы, для арганізацыі работы ў клюбе, чырвоным кутку і дзіцячай пляцоўцы.
Аддзелы часопісі: У дапамогу „затейніку“. Практыка „затейнік“ работы. Эстрадна-сцэнічны матар'ял. Гульні, фокусы, скокі, вопыт газэтнай работы. Дзіцкораўскі матар'ял. Культурны фронт (музыка, тэатр, кіно, кніга). Гурток кемлівых работ: галаваломкі, атракцыёны і г. д.
ЧАСОПІСЬ ВЫХОДЗІЦЬ ДВА РАЗЫ Ў МЕСЯЦ.
Падпіска на 1931 год працягваецца.
ПАДПІСНАЯ ЦАНА: на год—8 р. 50 к., на 6 месяцаў—3 р. 25 к., на 3 мес.—1 р. 65 к. Асобны нумар—30 к.
Падпіска прымаецца: аддзелам падпіскі БЕЛАРУСКАГА АДДЗЯЛЕНЬНЯ (Менск, вул. Леніна, № 16, тэл. 9-93), усімі магазынамі і АДДЗЯЛЕНЬНЯМІ КНІГАЦЭНТРУ „ОГИЗ'а“ і ўсюды на пошце.

Дзярж. выд-ва „Молодая гвардия“ Кнігацэнтр.
Усе прыхільнікі прыроды. Усе гурткі юных натуралістаў. Усе сялянскія школы і настаўнікі Піянэраграды і яч. камсамолу, Бібліятэкі і хаты-чытальні, Камуны, саўгасы і калгасы
ПАВІННЫ ВЫПІСВАЦЬ
ІЛЮСТРАВАНУЮ НАВУКОВУЮ ЧАСОПІСЬ
„Юный натуралист“
Орган ЦБ ДКА
Адк. рэдактар І. Разін.
ВЫХОДЗІЦЬ 12 № У ГОД • ГОД ВЫДАНЬНЯ 4-ы
Часопісь абслугоўвае дзяцей, якія цікавяцца прыродазнаўствам, якія працуюць над вывучэньнем прыроды (гурткі юнатаў), шляхам марксыцкага асьвятленьня важнейшых пытаньняў прыродазнаўства і кіруе іх практычнай работай. Дае матэрыял аб дасьледчай рабоце юных натуралістаў, дасьлетарыял для школьных вопытаў па прыродазнаўстве ў школах ФЗС.
Пры часопісі ёсьць пастаянная кансультацыя па пытаньнях масавай работы юнатаў.
Падпіска на 1931 год працягваецца.
ПАДПІСНАЯ ЦАНА: на год (12 №№) — 3 р. 20 к., на 6 мес. (6 №№)— 1 р. 60 к., на 3 мес.—(3 №№)—80 к. Асобны нумар—30 к.
ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: аддзелам падпіскі БЕЛАРУСКАГА АДДЗЯЛЕНЬНЯ (Менск, вул. Леніна № 16, тэл. 9-93), усімі магазынамі і АДДЗЯЛЕНЬНЯМІ КНІГАЦЭНТРУ „ОГИЗ'а“ і ўсюды на пошце.

У адказ шкоднікам і меншавікам-інтэрвэнтам дамо 25.000.000 рублёў на абарону СССР.
Са студзеня м-ца 1931 г. Асоавіяхімам праводзіцца па СССР рэалізацыя 35.000.000 білетаў 5-й Усесаюзнай лётарэі на суму 25 мільёнаў рублёў. Усе білеты разьбіты на 10 самастойна тыражыруемых разрадаў. Па 5-й лётарэі разыгрываецца 340.842 каштоўных выйгрышы на агульную суму 4.010.000 рублёў.
ГАЛОЎНЫЯ ВЫЙГРЫШЫ:
3 ВЫЙГРЫШЫ—падарожжа вакол сьвету (тэрмінам на 4 месяцы), камбайн з трактарам і с.-г. абсталяваньнем (па выбары), коштам па 10.000 рублёў кожны.
13 ВЫЙГРЫШАЎ—падарожжа вакол сьвету (тэрмінам на 2 месяцы), трактар з с.-г. абсталяваньнем, аўтамабіль (па выбары), коштам па 5.000 рублёў кожны.
22 ВЫЙГРЫШЫ—маторная лодка, жарабец-вытворца (па выбары), коштам па 1.000 рублёў.
104 ВЫЙГРЫШЫ—малатарня з прыводам, рабочы конь, абсталяваньне для сталярнай майстэрні (па выбары), коштам па 500 рублёў кожны.
380 ВЫЙГРЫШАЎ—валёсыпед, месца ў санаторыі (тэрмінам на 1 месяц), стрэльба паляўнічая дубальтоўка, сявярка 8-мі радная, жаняярка (па выбары), коштам па 200 рублёў кожны і рад іншых каштоўных выйгрышаў ад 10 да 100 рублёў кожны.
Той, хто купіць білеты ўсіх дзесяці разрадаў, прымае ўдзел ва ўсіх дзесяці тыражох.
Цана білетаў в 1 па 7 разрад па 50 к. і з 8 па 10 разрад па 1 р. за білет. Тыраж білетаў 1 разраду адбудзецца 15 красавіка ў г. КІЕВЕ. Тыраж білетаў 2 разраду будзе праведзен у канцы красавіка ў КРЫМЕ. Усяго ў 1 і 2 разраде разыгрываецца—35.328